Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 10 (392) Пятніца, 21 студзеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 90 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена, Менск. Комсам 25.

Бяз Леніна--па Ленінскі, па бальшавіцкаму!

Савецкая улада, плюс электрыфікацыя і буйная прамысловасьць, плюс коопэрацыя—вось шлях да соцыялізму, які запавядау нам Ільліч.

Чаму вучыў і што зрабіў Ленін?

У гісторыі ленінскага вучэньня і ленінскае справы—раней усяго неабходна выдзяліць бязьмежную цьвердую веру Леніна ў сілы рабочае клясы і ў неабходнасьці яе саюзу з сялянствам. Ён не памыліўся ў гэтай сваей веры Пад яго геніяльным кіраўніцтвам массы ў 1917 годзе зрабілі кастрычнікавую рэволюцыю і сьмянілі існаваўшы парадак рэчаў.

Ленін быў вучням другога вялікага правадыра і настаўніка пралетарыята К. Маркса.

Вучэньне Маркса аб капіталізме, аб нязьбежнасьці яго пагібелі, аб ролі пролетарыята ў гісторыі чалавецтва —Ленін прадаўжаў прыстасоўваючы да сучаснай нам эпохі імпэрыялізму, імпэрыялістычных войн і пролетарскай рэволюцыі... Ленін аб'яднаў тэорэтычнае вывучэньне навукі пролетарыяту—Марксізм з барацьбою за тое, каб скінуць уладу буржуазіі.

Як Маркс, так і Ленін вучылі, што працівалегласьць інтарэсаў буржуазіі і пролетарыяту павінна няпрыменна прывесьці к зьніштажэньню буржуазнай улады шляхам узброеннага паўстаньня пролетарыяту.

Ленін быў пагрозаю і бічым для ўсіх прадажнікаў рабочае клясы—меншавікоў, эсэраў, і г. д., бо яны прапаведвалі, што рабочая кляса можа бяз узброенага паўстаньня мірным шляхам дабіцца паляпшэньня свайго экономічнага становішча і свайго асвабаджэньня. Толькі Ленін простаю мовяю мог расказаць рабочаму ўсю гнуснасьць, усю трусьлівасьць соцыял прадажнікаў прапаведваючых згоду з буржуазіяй.

Ленін жа выпрацаваў вучэньне аб саюзе рабочае клясы і сялянства аб кіраўнічай ролі пролетарыяту ў рэволюцыі аб саюзе рабочае клясы і бяднейшага сялянства з серадняком.

Ленін стварыў жалезную партыю рабочае клясы партыю комун'стых, ні на крок не адступаючую ў барацьбе за асвабаджэньне рабочае клясы, партыю адзіную, згуртаваную, дысцыплінаваную, вядучую, няпрымірымую барацьбу з буржуазіяй і з яе служкамі—здраднікамі.

Ленін стварыў Комуністычны Інтарнацыянал, даў програму яго дзеяньняў і работы і паказаў вялікі шлях да ўсясьветнай рэволюцыі.

Вялізная заслуга Леніна ў тым, што ён прама і ясна адзначыў шлях Савецкай краіны ў выпадку затрымкі ўсясьветнай рэволюцыі—шлях пабудаваньня соцыялізму нават у аднэй краіне. Аб гэтым забылі тыя тава рышы, якія цяпер ня вераць у такую магчымасьць.

Ленін учытваў усю важнасьць работы рэволюцыйных партый на Усходзе, дзе абуджаецца нацыянальная сьвядомасьць і дзе фарміруюцца небачаныя па сваей колькасьці і энэргіі масы змагаьнікаў супроць імпэрыялізму.

Ленін жа зьяўляўся ідэёвым правадыром і кіраўніком Чырвонай арміі.

З яго вучэньня аб узброеным паўстаньні—ні дзеля захопу ўлады вынікала неабходнасьць організацыі Чырвонай арміі, арміі пролетарыяту і сялянства.

Мы, калі жывём у эпоху прэтварэньня вучняў Леніна ў жыцьцё, павінны на кожным кроку правяраць сваю работу па Леніну. Мы павінны ўмець таксама, як і ён упарта вучыцца, уважліва і строга правяраць усе свае дзеяньні, усю сваю работу і таксама, як і ён рашуча і настойчыва змагацца супроць усякіх ваганьняў, няверыя ў нашы сілы, супроць пераацэнкі і недаацэнкі нашых цяжкасьцяй і дасягненьняў.

9 студзеня

Дзень 9 (22) студзеня 1905 году, атрымала гістарычна замацованую назву: крывавая нядзеля.

Гэта быў дзень, калі рабочая кляса, сустрэнутая с вінцовым дажджом царскіх катаў, абліла сваёю крывёю камяніцы Пецярбургу (цяперашняга Ленінграду). Але разам з тым гэты дзень стаў і днём рэволюцыйнага прабуджэньня шырокіх рабочых мас.

У дзень крывавае нядзелі рабочая кляса загубіла веру ў цара, загубіла надзею атрымаць з рук цара паляпшэньне свайго жыцьця. Цар уласнымі рукамі расстраляў гэтую веру.

Вера ў цара была, вядома, найвялікшаю памылкаю рабочае клясы. Гэтая памылка мяшала ім стаць на правільны шлях да свайго вызваленьня ад прыгнёту царскага самаўладцтва і капіталістых.

9 студзеня рабочыя масы нашлі гэты шлях—шлях рэволюцыйнай барацьбы і з царскім самаўладцтвам і з капіталістымі. Вось з гэтага дню пачалася першая расійская рэволюцыя 1905 г.

Водгукі царскіх стрэлаў пракаціліся па ўсёй краіне і ўсюды выклікалі ўзрыў абурэньня рабочых. Забастоўкі, дэмонстрацыі, стычкі і бойкі з поліцыяй і войскамі на вуліцах гарадоў—вось як адказвалі рабочыя Расіі на царскі расстрэл іх Пяцярбурскіх братоў.

І вёска, прыцiснутая паліцэйскім ботам і прыгнёгам пана, таксама пачула аб царскім разстрэле рабочых. Гэты разстрэл палажыў пачатак і рэволюцыйнаму руху селяніна. Выступленьні сялян, якія пачаліся ў Курскай губэрні, перакінуліся на Украіну.


Па маёнтках паноў загуляў чырвоны певень. Але гэта было і раней. У гэтым-жа руху вёскі зьявілася новае, нечуванае. У барацьбе з панамі менавіта пасьля 9 студзеня вёска ў першы раз прызначыла забастоўку.

Сяляне вучыліся ў рабочых, сяляне пераймалі рабочыя спосабы барацьбы. У гэтым і заключалася ня толькі павышэньне сьвядомасьці сялянства, але такім шляхам выкоўваўся рабоча-сялянскі саюз. Пачатак яго, такім чынам, паложаны 9 студзеня.

Вось чаму, не глядзячы на тое, што дзень 9 студзеня ёсьць дзень глыбокай смуты памяці ахвяр царскай расправы, ён разам з тым зьяўляецца і сапраўдным рэволюцыйным сьвятам рабочых і сялян Савецкага Саюзу.

Арасіўшы сваёю крывёю пецярбурскую камяніцу ў дзень 9-га студзеня, пролетары Расіі палажылі першыя камяньні вялікай рабоча сялянскай рэволюцыі, якая стварыла першую ў сьвеце пролетарскую дзяржаву.

І. Флероўскі.



Як вучыу Ленін—будаваць соцыялізм.

Пытаньне, ці пабудуем мы ў нашай краіне соцыялізм—партыя вырашае так, як вучыў Ленін.

Калі савецкая ўлада перажыла цяжкі час

па загаду Леніна было распачата пабудова вялізнай Волхоўскай электро-станцыі

Нельга было распачынаць гэта будаўніцтва, ня будучы ўпэўненым у тым што соцыялізм пераможа. У 1920 годзе, калі ўся краіна была разбурана, толькі Ленін абараняў плян электрыфікацыі краіны. Бяз упэўненасьці ў перамозе соцыялізму нельга было высоўваць такі плян.

«Соцыялізм--гэта вучот»—казаў ён

Гэтымі словамі ён прывучыў рабочых і сялян да плянавай, разумнай гаспадаркі „Коммунізм—казаў ён—гэта савецкая ўлада плюс электрыфікацыя". Гэтым ён даказваў што ў нашай краіне можна пабудаваць комунізм, бо першыя ўмовы перамогі комунізму—савецкая ўлада—у нас ёсьць.

Ленін, як і партыя па яго наказах, вучыў таму, што

канчатковая перамога соцыялізму забясьпечна будзе толькі рабочай рэволюцыяй.

Яшчэ ў час імпэрыялістычнай вайны Ленін вучыў, што соцыялізм зможа перамагчы ў аднэй краіне. Проціў гэтага тады спрачаўся тав. Троцкі. Бязумоўна, Ленін казаў правільна. І ў 1919 годзе Ленін даказаў, што пабудаваць соцыялізм у нашай краіне магчыма.

Гістарычны дакумант

Урадавае паведамленьне аб сьмерці ЛЕНІНА.

21 студзеня ў 6 гадзін 50 мінут вечару ў Горках, каля Масквы, памёр Уладзімір Ільліч Ульянаў-Ленін.

Нішто не паказвала на блізкасць сьмерці. За апошні час у становішчы здароўя Уладзіміра Ільліча пачалося значнае палепшаньне. Усё застаўляла думаць, што яго здароўе будзе папраўляцца.

Зусім нечакана ўчора ў становішчы здароўя Уладзіміра Ільліча настала рэзкае пагоршаньне.

Праз некалькі гадзін пасьля гэтага Уладзімір Ільліч памёр.

Усерасейскі зьезд саветаў, які цяпер пасядае ў Маскве, і Усесаюзны зьезд, які скора адчыніцца, прымуць усе пастановы, неабходныя дзеля таго, каб далейшая праца Савецкага ўраду магла весьціся без перарыву.

Самы цяжкі ўдар, які пасьціг працуючых Савецкага Саюзу, а таксама і ўсяго сьвету, ад часу заваяваньня ўлады рабочымі і сялянамі Расіі, глыбока ўсхваліць сэрца кожнага рабочага і селяніна не толькі ў нашай рэспубліцы, але і ва ўсіх краёх.

Самыя шырокія масы працуючых усяго сьвету будуць аплаківаць свайго найвялікшага правадыра. Яго больш няма сярод нас, але яго справа застанецца непарушнай. Выконваючы волю працуючых масаў, Савецкі ўрад будзе весьці далей працу Уладзіміра Ільліча, ідучы далей па начэрчанаму шляху. Савецкая ўлада заўсёды стаіць на сваім пасту — на абароне заваёваў пралетарскай рэвалюцыі.

Масква, Крэмль, 22-га студзеня 1924 г.

Тры гады бяз Леніна

Прашло тры гады з таго часу, як мы ў вялікую сьцюжу, у студзені месяцы, аднесьлі цела Леніна да крамлёўскай сьцяны. Сотні тысяч рабочых і сялян прашлі каля труны Ільліча, і ў кожнага, разам з болью аб утраце, паўставала трывожнае пытаньне: як жа будзе без яго? Ці справімся? Ці не саб'емся мы з дарогі?

Цяпер, праз тры гады кожны бачыць, што з дарогі мы ня зьбіліся, бо—

Мы ідзём уперад.

Гэта прызнае кожны, нават вораг працоўных калі ён ад злосьці зусім не асьлеп і не аглух.

Яшчэ так нядаўна мы ўсе мучыліся з папяровымі мільярдамі.

Цяпер—грошы ў нас устойчывыя. Тавараў, патрэбных для вёскі, стала значна больш.

Лепш працуе прамысловасьць. Ні адзін завод, які хоць крыху чаму варт, не стаіць без работы. Ставяцца новыя машыны,

будуюцца новыя фабрыкі і заводы

На днях пушчаны ў ход магутныя машыны Волхоўскай электрычнай станцыі і дзяшовая энэргія пабегла па дроце да станкоў Ленінградзкіх заводаў. А яшчэ ў 1924 г. у нас ня было яшчэ цьвёрдай пераконанасьці, што ўдасца добра даарудаваць першую станцыю з цэлага шэрагу станцый, намечаных Леніным.

У Ленінградзе ў аграмаднай майстэрні Пуцілаўскага заводу цяпер выраб'яюцца трактары.

Лепей стала і з дробнымі сельска-гаспадарчымі прыладамі: плуг, барана, каса ўжо вырабляецца на нашых заводах.

За апошні год на паўтара мільёны павялічылася рабочых, мільярд рублёў урад адпушчае на разьвіцьцё і палепшаньне нашай фабрычна-заводзкай гаспадаркі. Падымаецца сельская гаспадарка. Коопэрацыя выпіхае гандляра і кулацкага скупшчыка. Лепш працуюць саветы на вёсцы.

Політыка міру

Калі ў нас панаваў голад, беднасьць, было ўсё раскідана, заходня-эўропскія капіталістыя надзеяліся, што мы згінем, не справіўшыся з цяжкай задачай—адбудовай краіны.

Замежныя капіталістыя стараюцца зрабіць розныя перашкоды на шляху нашага разьвіцьця.

Цяпер гэтыя надзеі рухнулі.

Наша ўлада на ўсе гэтыя варожыя адносіны адказвала мірнай дзелавой політыкай.

Ня так даўно мы заключылі такую дзелавую згоду з літоўскім урадам Цяпер там, па ўказваньню Англіі, адбыўся пераварот, і ва ўладзе стаў урад палачоў, якія за англьскае золата гатовы кінуць тысячы рабочых і сялян супроць нашых граніц. Такі-ж малюнак на польска-румынскай і на кітайскай граніцах.

Пад кіраўніцтвам партыі

Калі памёр Ленін, дзьве сотні тысяч рабочых уступілі ў комуністычную партыю для таго, каб дапамагчы ей у працы.

З таго часу яшчэ шмат тысяч, перадавых рабочых і сялян уступілі ў шэрагі ўсесаюзнай компартыі.

Ленін вучыў, што адбудоўваць краіну мы можам толькі беручы пад увагу інтарэсы вёскі, прыглядаючыся да яе запытаньняў.

Невялікая група ў Цэнтральным Камітэце партыі пашла па няправільным шляху у адносінах да інтарэсаў вёскі, а партыю за яе політыку цеснай сувязі з вёскай, абвінавачала ў кулацкім ухіле.

14 зьезд і 15 партыйная конфэрэнцыя партыі зганілі гэту лінію. Бо будаваць гаспадарку, у згодзе з патрэбамі большасьці бедняцкай і серадняцкай вёскі, гэта і значыць ісьці па ленінскім шляху.

Мы справіліся з разбуранай гаспадаркай, голадам і з кожным днём паляпшаем сваё жыцьцё.

Мы будуем новыя заводы і фабрыкі, каб забясьпечыць сабе таварамі і машынамі.

З жыцьця Уладзімера Ільліча

Замах на Ўладзімера Ільліча Леніна

(Успаміны тав. Бонч-Бруевіча)



Ўладзімер Ільліч ляжаў на правым баку на пасьцелі, якая стаяла ў суседнім пакоі бліжэй да вакна, і ціха стагнаў Твар яго быў бледны. З пад разарванай кашулі на грудзёх і левай руцэ відны былі дзьве раны на плечавой касьці. Па тую сторану ад пасьцелі стаяў тав. А. Н Вінакураў, які раней другіх прышоў пасьля пасяджэньня Саўнаркому. Я прапанаваў зараз жа заліць рану ёдам, каб захваць ад заражэньня. Тав. Вінакураў гэта і зрабіў. Я стаяў ля галавы т. Леніна. Ён расплюшчыў вочы, засмучона паглядзеў на мяне і сказаў:

— Баліць, сэрца баліць... Вельмі сэрца баліць.

— Сэрца ваша не зачэплена... Бачу я раны, яны толькі на руцэ... І гэта нэрвовая боль—сказаў я яму, стараючыся быць спакойным.

Ён заціх і заплюшчыў вочы. Цераз хвіліну ён застагнаў ціха, стрымана, як-бы баючыся каго ўзьнепакоіць.

— І нашто мучаць, лепш бы забівалі зразу,—сказаў ён і ціха змоўк.

Хвароба тав. Леніна

Я ўбачыў Уладзімера Ільліча 11 сакавіка 1923 год. Ён быў вельмі хворы: высокая тэмпэратура, поўны паралюш правае рукі і ногі. Ня гледзячы на затуманенную прытомнасьць, ён пазнаў мяне. Ён ня толькі раз, але некалькі разоў паціснуў мне здаровай рукою руку і, відаць, задаволены тым, што я прышоў, пачаў гладзіць маю руку. Пачаўся цяжкі дагляд за хворым, цяжкі таму, што хворы ня мог гаварыць.

Сьвежае паветра, добрыя харчы рабілі сваю справу, і Ўладзімер Ільліч паступова дужэў.

Ўладзімер Ільліч усьміхаўся на жарты. Зьбіралі грыбы; гэта Ўладзімеру Ільлічу вельмі падабалася Як сьмяяўся ён над тым, што я ня ўмею зьбіраць грыбоў, калі ён сам заўважваў іх здалёку. Здароўе папраўлялася так скора, што я спакойна паехаў у водпуск у сярэдзіне жніўня.

Вярнуўшыся з водпуску, я некалькі разоў наведваў Уладзіміра Ільліча, прыяжджаў з Н. Н. Прыоравым і шаўцом ортопэдычнае абуві, каб наладзіць спачатку звычайнае абуцьцё, а потым і для зямлі.

Проф Розанаў

Удзельнічаць у пабудове социялізму.

Аддана змагацца за падняцьце вытворчасьці, вучыцца і вучыцца—заданьні рабочай моладзі у Ленінскія дні.

За якасьць экономпрацы!

(Да усебеларускай нарады экономпрацаунікоу комсамолу)

Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ склікаў ўсебеларускую экономнараду прац ўнікоў Акругкомаў. прадстаўнікоў Комсамолу ў Цэнтральныя праўленьні прафсаюзаў і прадстаўнікоў Комсамолу ў шэраг фабрычна заводзкіх камітэтаў.

Праца гэтай нарады будзе праходз'ць ва ўмовах, калі прамысловасьць Беларусі з пэрыоду аднаўленьня пераходзіць у пэрыод рэконструкцыі з тым, каб паставіць новае прамысловае абсталяваньне і пабудову новых заводаў. Гэтае становішча ў вядомай меры кладзе свой адбітак на пабудове ўсёй нашай экономічнай працы якая праводзіцца Комсамолам сярод рабочай моладзі.

Вырашэньне стоючых пытаньняў, як у галіне броні, звыш броні вучнёўства павінна цесна ўвязацца з чарговымі задачамі, якія стаяць перад прамысловасьцю, інакш быць ня можа. Мы маем у гэтым пытаньні пастановы 14-га парт'ъезду і комсамольскіх зьездаў. Для гэтага нам неабходна будзе падагуліць якія мы маем дасягненьні, а яны ў нас ёсьць, дзе нашы недахопы—яны таксама ў нас маюцца, усе гэта падагульніўшы мы павінны будзем вызначыць асноўныя палажэньні.

Як быць з выкананьнем існуючага законадаўства, як быць з формамі і мэтодамі ў вылічэньні броні, як разбраніраваць парастакаў. задачы ў гэтай галіне ячэек, праф саюзаў, Наркампрацы. Таксама вы начыць шляхі праведзеньня звыш броні з вучотам асноўнай лініі далейшага праведзеньня.

У галіне вучнёўства—яго пашырэньня, якаснага паляпшэньня, зрабіць пералом у гаспадарчых працаўнікоў, прыцягнуць увагу органаў Галоўпрофасьветы.

У галіне пастаноўкі масавай экономічнай працы змагчы ўцягнуць у экономічную працу масы комсамольцаў рабочай моладзі, большай зацікаўленасьці ў масавых рабочых організацыях як прафсаюзаў, коопэрацыі, саветаў рабочай моладзі.

У галіне барацьбы з беспрацоўем змагчы дастаткова прыкаваць грамадзкую думку да гэтага пытаньня, вызначыць шляхі яе ліквідацыі ўвязваючы яе з агульным плянам.

Палепшыць працу юнсэкцыі, разгарнуць культурную працу, умела зьвязацца з агульнымі юнсэкцыямі для прыняцця мер к ліквідацыі беспрацоўя сярод юнацтва. Гэта нам неабходна праведзьці. Сумець наладзіць дзелавыя ўзаемаадносіны з самагужнікамі з тым, каб пабольш уцягнуць у яе падросткаў—шляхам шырокага растлумачваньня льгот. Гэта нам неабходна мець на ўвазе.

У вёсцы трэба шырэй разгарнуць працу, каб якасна палепшыць, колькасна разгарнуць працу па заключэньню дагавароў. Сумець падрыхтаваць батрацтва ў пэрыяд, калі пачнецца вясеньняя кампанія. Разгарнуць шырокую выхаваўчую працу з боку вясковых ячэек, наладзіць дзелавыя ўзаемаадносіны Комсамолу з Усерабзямлесам. Без гэтага мы шырока ўперад пайсьці ня зможам у галіне экономпрацы.

У адносінах аздараўленьня неабходна падагуліць становішча здароўя рабочай моладзі на падставе вынікаў мэдагляду 1926 году. Вызначыць конкрэтна задачы ячэек у гэтай галіне, Больш і лепш наладзіць працу ў органах аховы здароўя. Разгарнуць аздаравіцельную працу.

Нарэшце, нарадзе трэба будзе заслухаць вынікі ўсесаюзнай экономічнай нарады, ўзяць ад якой нам трэба лінію, якую трымае наш саюз у экономічнай працы. Ведаць бліжэйшыя задачы—мы думаем атрымаць ад дакладу Галоўнае, што нам трэба атрымаць ад нарады гэта вопыт месц каб паглядзець, як праводзяцца ў жыцьцё дырэктывы партыі і Комсамолу ў галіне экономічнай працы. Мы думаем, што гэтага дасягнем.

У беларускую організацыю ЛКСМ уліліся яшчэ 2 організацыі—Гомельская і Рэчыцкая, у якіх маецца значная частка рабочай моладзі. Гэтыя організацыі маюць вопыт у сэнсе пастаноўкі экономпрацы.

Мы думаем, што таварышы з далучаных мясцовасьцяў змогуць нам гэты вопыт перадаць, лепшае з яго мы, вядома, выкарыстаем для нашай практычнай працы.

Пры належнай увазе і актыўнасьці з боку экономпрацаўнікоў пастаўленых задач дасягнем.

З. Мірычгоф.

Гвалты пілсудчыны над „Грамадой“.

Панскаму разгулу і гвалту няма канца краю

Арыштаваны беларускія дэпутаты сойму.

Ноччу з 14 на 15 студзеня у Вільні арыштаваны дэпутаты польскага сойму ад Беларускае Грамады: Тарашкевіч, Валошын і Рак Міхайлоўскі

Разам з імі арыштавана яшчэ 30 беларускіх дзеячоў

Новае злодзейства польскай ахранкі.



Зьбітыя польскай паліцыяй і ахранкай сябры беларускай грамады: Селянін Ваўчок, на кватэры якога знаходзіліся сябры грамады і удзельнікі конфэрэнцыі —Валошын і Мятла.



Зьбівалі сяброў грамады у час зьезду у вёсцы Старая Бярова. На сьпіне селяніна Ваўчка прыметны рубцы ад катаваньня паліцыянтаў.

Арыштоўваюцца члены грамады па ўсёй Польшчы

У афіцыйным паведамленьні зазначана, што ў адной Варшаве арыштавана 120 чалавек і зроблена 200 вобыскаў. Вобыскі і арышты адбываліся апроч Варшавы, у Лодзі, Пазнані і на ўсёй тэрыторыі Заходняе Беларусі.

Лік арыштаваных у Вільні і іншых гарадох—невядомы.



Беларускія дэпутаты Валошын і Мятла зьбітыя польскімі паліцыянтамі.

У Віленшчыне і Навагрудчыне 200 арыштаваных

Па вестках з польскіх газэт вядома, што лік арыштаванных у Віленскім і Навагрудзкім ваяводзтвах дасягае да 200 чалавек. Газэта „Варшавянка“ паведамляе, што „Беларуская Грамада“ абвешчана нелегальнай.

Польскія буржуазныя газэты стараюцца стварыць уражаньне, нібыта Беларуская Грамада „Кіравалася Комінтэрнам на савецкія грошы“.

Адзначаем трэцюю гадавіну

Школа вучнеуства МББ, комсамольскі колектыу

3 гады таму назад адначасова з адчыненьнем Менскай школы вучнёўства МББ, з'організавалася і ячэйка Комсамолу.

У пэрыод трохгадовага існаваньня ячэйкі, значная доля працы выпадала на адбудаваньне паўразбуранай школы, у школу сапраўдна выхоўваючую кадры рабочай моладзі ў вытворчым навыку.

Удзел у гаспадарчым будаўніцтве

Трэба сказаць, што комсамольская маса ў асноўным зразумела тую важнасьць удзелу Комсамолу ў галіне гаспадарчага будаўніцтва краіны, адсюль павялічылася цікавасьць да вытворчасьці, спыніліся спазьненьні на працу, і амаль зусім няма выпадкаў самавольных прагулаў. Маецца цэлы шэраг фактаў, калі комсамольцы высоўваюць пытаньні, якія выяўляюць моманты і скажэньні рэжыму экономіі напрыклад: хлопцы высунулі пытаньне ці патрэбен загадчык агульнага памяшканьня ФЗУ, які па праўдзе нічога ня робіць, а толькі дармова грошы атрымоўвае: аб зьнішчэньні кантрольных картак, якія зусім нічога не даюць, а час вучня і папера трацяцца дарма. І іх зьнішчылі.

Маецца таксама значнае дасягненьне ў галіне падняцьця кваліфікацыі з боку моладзі і павялічэньне вытворчасьці працы (калі мы мелі у мінулым годзе 40 проц. агульнай выпрацоўкі вучня, дык у сучасны момант мы маем 70-85 проц. выпрацоўкі нормы).

Рост колектыву і парт'ядро

У сучасны момант налічваецца 160 чалавек.

Колектыў увесь разьбіты на 3 цэхавыя ячэйкі. У лічбовы склад колектыву ўваходзіць невялікая частка дзяцей чыгунічнікаў, якія вучацца ў школах, іншыя ж гэта тыя, якія выключна працуюць у вытворчасьці. Процант беспартыйнай моладзі адносна да ўсяго ліку працуючых на вытворчасьці складае 42 чалавекі.

Парт'ядро складае 15 працантаў адносна ўсяго складу колектыву, ня ўключаючы сюды прымацаваных.

Выхаваўчая праца.

Нагрузка практычнай працай комсамольцаў дасягае 72 проц. Усіх уцягнуць немагчыма, дзякуючы вялікаму складу колектыву. Выдаецца насьценгазэта, навокал якой гуртуецца група сьценкораў у 20 чалавек. Газэта дапамагае выхаваўчай працы, як у грамадзкім так і ў асабістым жыцьці комсамольцаў.

Слаба справа абстаіць з політычным выхаваньнем. Вучні ФЗУ не ўключаны ў агульную сетку політвыхаваньня, а праходзяць у школе. Але ў школе дзякуючы перагрузцы настаўнік-грамадавед у гэтым годзе за 1/3 навуковага году, правяліў на 75 проц., у той час, калі гэта трэба было ўмацніць. Другую справу маем з хлапцамі-комсамольцамі ў вытворчасьці. Там амаль усе займаюцца ў розных вячэрніх школах.

„Вулькан“.

(Менск, Шкляны завод „Пролетары“.).

Шкляны завод „Пролетары“—раскіданы паміж 2-х чыгунак, цэлы дзень дыміць сваімі трубамі.

6 гадзін раніцы. Гудок.

Па ціхіх вуліцах ваколіцы ідуць адбіваючы такт сваймі трэпам.*), рабочыя на працу.

Кожны з іх бярэ ў руку доўгую трубку, набірае з вялічэзнага катла шкла, робіць на ім 2-3 прыёмы і праз поўхвіліны — бутэлька гатова. І так 6 гадзін. А праз 6 гадзін, зноў раве гудок, прыходзіць новая зьмена адпачыўшых рабочых.

І так што дзень.

Перапынку няма ні ў дзень ні ў ноч. — Тэмпэратура у 1200 градусаў, не павінна зьмяншыцца, бо калі шкло астыне — будзе гора, вава стане.

І таму дзень і ноч гараць вагонь, дзень і ноч льюць у ванну**) нафту. Завод працуе і 450 чалавек рабочых, стараюцца штодня падняць вытворчасьць працы, палепшыць якасьць продукцыі, зьнізіць сабекошт, даць рабочаму і селяніну Беларусі танны і добры тавар. Першы прыклад у гэтай працы падаюць комсамольцы. — Ні адно пасяджэньне вытворчай камісіі — не абышлося без таго, каб комсамольцы не прымалі ў ім удзелу.—Гордасьць усяго заводу — гэта комсамолка—майстар т. Сабіцкая.

У БССР, нават і у СССР няма таго, каб жанчына была выдувальшчыцай шкла. А вось Сабіцкая—комсамолка, вывучылася гэтай працы і і не гледзячы на насьмешкі некаторых рабочых працуе і павялічвае сваю кваліфікацыю. — Яе прыкладу вучацца і другіе жанчыны.

А вось вялікі як добрая плошча—двор заводу. Усюды горы шкла. Яго сеюць, сартыруюць—і ў печ.

На двары капашыцца стары чалавек. Гэта стары гаспадар гэтага заводу. А цяпер ён працуе на заводзе, састаіць сябрам саюзу, і як ён мне казаў на вытворчай нарадзе галасуе за падняцьце вытворчасьці і за рэжым экономіі на сваім былым заводзе.

Зноў раве гудок. Умыўшыся і паснедаўшы ўсе рабочыя ідуць у чырвоны куток пры заводзе. Там доктар трымаючы ў руцэ чэрап, паказвае рабочым, як зложана і працуе галава чалавека, апавядае чым і як дышуць людзі, і ад чаго паміраe чалавек. Ціха і ўважліва ўсе слухаюць яго.

А вось побач гурток па ліквідацыі няпісьменнасьці. Жанчына-адносчыца***) гадоў пад 60 старанна выводзіць крэйдай, літары. Рука дрыжыць, але літара напісана. А там бібліотэкар комсамолец т. Багдановіч, выдае рабочым кніжкі і радасна апавядае што лік падпішчыкаў бібліотэкі перавяліў за 400 чалавек.

За сталом група рабочых піша колектыўны доліс у насьценгазэту юбілею якой чакаюць з дня на дзень. Выходзіць пятнаццаты нумар 1 0 дапішчыкаў, гара допісаў, вялікі аўторытэт сярод рабочых вось дасягненьні газэты. А гэта каштуе юбілею.

А вось піонэры праводзяць заняткі зьвяна. Бойкі хлапец апавядае аб паўстаньні ў Літве, і аб расстрэле 4 літоўскіх комуністаў.

Крэпкі, моцны, спаяны комсамольскі колектыў, паставіў ў парадак дню лёзунг „Далоў п'янства“.

Маленькі, з 20 рабочымі завод вырас. Праца цяпер ідзе ў чатыры зьмены. Завод дае значны прыбытак. Сіламі рабочых і комсамольцаў адбудаваны новы пажарны сарай.

Праца ідзе. Цямнее... Ціха... Комсамольцы-пажарнікі, ходзяць і гаспадарчым вокам паглядаюць за вагнем. Гудзіць, поўная да верху гарачым шклом, ванна. 12 гадзін ночы...

Гудок. З песьнямі, з прыбаўткамі выходзяць з варот рабочыя, а на іх месца уліваюцца новыя... І зноў па ціхіх вуліцах Менскай ваколіцы адбіваюць трэпамі такт, рабочыя.

Калі ідзеш здалеку то здаецца вулькан раскідае вогненныя языкі полымя... А як падыдзеш бліжэй, то ўбачыш як сотні рабочых працуюць над сваімі станкамі шкляной гуты „Пролетары“.

Эд. Галубок.

*) трэпы—драўляные боты, рабочых.

**) ванна—дзе вараць шкло.

***) Адносчыца—якая адносіць шкло, у печ да закалкі.

Каляндар падзей на Беларусі

— 1917 г.—Жнівень—Вышаў з друку першы нумар бальшавіцкай газэты «Звезда»

— 1917 г. 3 сьнежня. У Менску адбыўся першы зьезд салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

— 1918 год 30 сьнежня. Адбыўся першы ўсебеларускі зьезд Комуністычнай партыі на Беларусі.

— 1918 год.—Сьнежань—Заснаваньне організацыі комсамолу на Беларусі.

— 1919 год 1 студзеня. Абвяшчэньне Незалежнай Беларускай Социялістычнай Рэспублікі.

— 1919 год. 3 лютага. Адчыніўся першы ўсебеларускі зьезд саветаў у Менску

— 1919 год. 5 лютага. усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт прызнаў незалежнасьць Савецкай Беларусі

— 1919 год. 6 лютага. Абвешчана конституцыя Савецкай Социялістычнай Рэспублікі Беларусі

— 1919 год. 27 лютага. Утварылася аб'яднаньне Савецкіх Социялістычных рэспублік Літвы і Беларусі.

—1919 год. 3 сакавіка. Адбыўся першы аб'яднаны зьезд Комуністычнай партыі Літвы і Беларусі ў Вільні.

— 1919 год 8 жніўня. Польскае войска заняло Менск.

— 1920 год. 30 мая. Белапольскія банды спалілі горад Барысаў.

1920 год. 11 ліпеня. Вызваленьне Беларусі ад белапольскіх войск.

— 1920 год 10 жніўня. Вышаў першы нумар беларускай газэты «Савецкая Беларусь».

— 1920 год 11 ліпеня. Адчыненьне Дзяржаўнага Беларускага Унівэрсытэту ў Менску

— 1921 год 16 студзеня. Саюзная ўмова паміж РСФ Р і БССР.

— 1921 год 15 верасьня. Адчыненьне Беларускага Дзяржаўнага Музэю.

— 1921 год. 17 верасьня. Адчыненьне Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.

— 1922 год. 20 лютага. Заснаваньне Інстытуту Беларускай культуры ў Менску.

— 1922 год. 17 сьнежня. Чацьверты Усебеларускі зьезд Саветаў Беларусі.

— 1923 год. 20 сакавіка Адчыненьне 12 й конфэрэнцыі Комуністычнай партыі Беларусі, на якой было паднята пытаньне аб пашырэньні Савецкай Беларусі.

— 1923 г.—28 лістападу.—Заснаваньне літаратурнай організацыі «Маладняк»

— 1924 год 4 лютага. Прэзыдыум Усесаюзнага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў прыняў пастанову аб пашырэньні тэрыторыі Савецкай Рэспублікі Беларусі.

— 1924 год. 13 сакавіка. Адчыненьне 6-га Надзвычайнага Ўсебеларускага зьезду Саветаў Пашыранай Савецкай Беларусі.

— 1925 год—7 га лістапада—Адчыненьне Беларускай сельска гаспадарчай акадэміі Імя Кастрычнікавай рэволюцыі.

1925 г.—4-га мая адчыніўся 7 усебеларускі зьезд Саветаў.

1926 г.—Сьнежань.—Далучэньне Гомельскага і Рэчыцкага паветаў Гомельскай губэрні да БССР.

Моладзь у краінах капіталу.

8 комсамольцаў за кратамі.

Нядаўна ў горадзе Мюнхэне, у Нямеччыне адбыўся процэс 8-мі комсамольцаў, якія абвінавачваюцца ў дзяржаўнай здрадзе. Гэтыя таварышы прымалі ўдзел 2-га сьнежня 1925 году ў нелегальнай акруговай конфэрэнцыі Комсамолу Паўднёвай Баварыі, якая была раскрыта паліцыяй. У часе суду, перад якім прадсталі 8 маладых рабочых, ім было прад'яўлена абвінавачваньне ў імкненьні да разбурэньня існуючага дзяржаўнага ладу. Калі-ж абвінавачаныя комсамольцы спрабавалі забараніць свае палітычныя перакананьні, яны былі пазбаўлены слова. У выніку 7 таварышоў былі прыгавораны да 3 месяцаў турэмнага зьняволеньня, а адзін з іх, якому 18 год да 6 тыдняў турэмнага зьняволеньня.

Беспрацоўе у Бэрліне

Па апошніх вестках працоўе сярод рабочай моладзі ў Нямеччыне і ў асабліваські ў Бэрліне з кожным днём прымае ўсё большыя размеры. У сучасны момант у Бэрліне налічваецца звыш 40.000 беспрацоўных маладых рабочых, пры чым большасьць з іх не атрымоўвае ніякага матэрыяльнага падтрыманьня з боку ўрадавых органаў.

Выключаны за паездку ў СССР.

Цэнтральным Камітэтам Соцыялістычнага Саюзу Моладзі Нямеччыны выключаны з шэрагаў Соцыялістычнага Саюзу маладыя соцыялісты, прымаўшыя ўдзел у другой нямецкай рабочай дэлегацыі, якая наведала СССР. Выключэньне выклікала протэст провінцыяльных організацый.

Школа актыву.

У Нямеччыне нядаўна закончылася 6-ці тыднёвая школа кіраўнічага актыву Нямецкага Комсамолу, у якой займалася 35 чалавек прадстаўнікоў усіх буйнейшых комсамольскіх організацый краіны. Школа прапрацавала усе асноўныя пытаньні марксізму і ленінізму, а таксама дала сваім слухачом шэраг практычных навыкаў для непасрэднай працы ў комсамольскіх організацыях.

Школа гэта дала Нямецкаму Комсамолу групу добра падрыхтаваных і працаздольных актывістых.

У Нямецкім Комсамоле.

У красавіку 1927 году Нямецкім Комсамолам утвараецца ўсенямецкае спатканьне ўсіх комсамольцаў. Спатканьне гэта будзе на вялікдзень, у буйнейшым партовым горадзе Нямеччыны, у Гамбурзе. Ужо зараз вядзецца ўзмацненая падрыхтоўка і пропаганда да гэтага дню. На гэтае спатканьне зьедуцца ўсе комсамольцы Нямеччыны.

За забойства здрадніка. (Польшча).

Нядаўна ў Польшчы адбыўся процэс сябра Комуністычнага Саюзу Моладзі ў Польшчы тав. Шленскага. Тав. Шленскі абвінавачваецца ў тым, што забіў здрадніка Ліпкоўскага, які выдаў у рукі паліцыі вялікі лік сяброў Польскага Комсамолу. Суд прыгаварыў тав. Шленскага да 12 год турэмнага зьняволеньня. У бліжэйшы час гэты таварыш зноў стане перад судом за прыналежнасьць да Комсамолу Польшчы. За гэтае яму пагражае яшчэ 8 гадоў катаргі.

М. Л.

Турмамі іх не запугаеш!

Кожны дзёнь усё больш і больш прыносіць вестак аб масавых прасьледваньнях маладых рабочых і галоўным чынам комсамольцаў за мяжою.

Не спадабалася паном Чэмбэрленам, Пілсудскім і інш „дазорцам народнага міру і спакою", посьпехі асобных атрадаў КІМ'у ўпарта штурмуючых капіталістычныя цытадэлі.

Але, ў іх ёсьць выхад. Зноў пусьціць троха крыві, зноў кінуць у турэмныя сьцены дзесяткі лепшых прадстаўнікоў моладзі, якая вядзе барацьбу на Захадзе.

У такіх выпадках яны ня трацяць многа слоў і прыступаюць непасрэдна да справы.

І вось якія іх справы.

У Ангельшчыне, здаволены першым пачаткам 1925 году, калі было засуджана 12 комуністаў у тым ліку і сакратар Ангельскага комсамолу т. Раст. Містэр Хікс в домы міністэр „унутраных спраў" Ангельшчыны рашыў разьвіць далей сваю дзейнасьць. І вось далейшыя ахвяры гаспадзіна Хікса.

У горадзе Рондо-Вэл арыштована цэлая група маладых гарнарабочых. Прычыны іх арышту невядомы. А ў горадзе Коўдэнбэст арыштован комсамолец за сказаную на сходзе прамову і прыгавораны да месячнага турэмнага зьняволеньня.

У Польшчы Пілсудзкі аказаўся больш добрым катам як Хікс. Нядаўна прыгавораны да 12 год катаргі комсамолец Шленскі, які забіў правакатара і ў сучасны момант прыгавораны яшчэ да 6 год катаргі за прыналежнасьць да комсамолу.

У Нямеччыне, у горадзе Мюнхэне, 7 комсамольцаў прыгавораны да розных тэрмінаў турэмнага зьняволеньня за ўдзел у раённай комсамольскай конфэрэнцыі. Праз некалькі дзён перад судом яшчэ 8 маладых таварышоў, засуджаных на трохмесячнае турэмнае зьняволеньне, за той-жа „учынак". Яны пакараны за ўдзел на конфэрэнцыі, якая праходзіла адкрыта з дазволам самой паліцыі.

Сакратар комсамолу Юга-Славіі прыгавораны да 1 году турмы „за комуністычную пропаганду, за распаўсюджваньне комуністычнай літаратуры, і сувязь з Масквою". Такое правасудзьдзе югаслаўскіх катаў.

Але і Аўстрыя на чале якое стаяць соцыял-дэмократы таксама ня ўступае іншым краінам. У часе нядаўна адбыўшыйся ў Вене дэмонстрацыі рэволюцыйнай моладзі супроць тэрару ў Бўўгарыі было арыштована 8 дэмонстрантаў.

Такі вынік прасьледваньня маладых барацьбітоў, славутых атрадаў міжнароднага юнацкага руху за апошні месяц. Мы ўжо ня кажам аб той вялізарнай страце, якую панёс палітычны Інтэрнацыянал Моладзі ў асобе аднаго з яго старэйшых кіраўнікоў таварыша Грэйфэнбэрга, расстралянага літоўскімі фашыстымі.

Кожная ахвяра, кожная страта ў шэрагах міжнароднага юнацкага руху жалем сустракаецца ўсёй пролетарскай моладзьдзю капіталістычных краін, а таксама і Савецкага Саюзу. Але мы прывыклі таксама гаварыць, што на страце аднаго, на адну ахвяру мы адказваем яшчэ з большымі патугамі будзем працягваць сваю работу і барацьбу.

І нашы братэрскія комуністычныя саюзы моладзі ў краінах, дзе з кожным днём белы тэрор прымае яшчэ больш шырокія размеры, прывыклі таксама на гэта рашуча адказваць усяму капіталістычнаму сьвету: турмамі нас не запужаеш.

М. Гамбургскі.



У маўзалея Леніна

Зьмена--падрыхтавана.

Дапрызыўная падрыхтоўка дала добрыя вынікі.

Вучобу—скончылі.

Гэта было ў суботу 8 студзеня у 8 гадзін вечару, калі політрук Менскага дапрызыўнага вучастку адчыніў урачыстае пасяджэньне прысьвечанае выпуску чырвоных дапрызыўнікаў.

Заля дому Працасьветы біткам набіта дапрызыўнікамі.

Іх усяго—338 чалавек... З іх 96 комсамольцаў.

— Цяжка было спачатку, ніяк ня верылася, кажа політрук, што ў нас будуць такія дасягненьні.

Маё пажаданьне вам—не забываць тыя веды, якія атрымалі тут.

20 проц. скончыла вучобу добра.

75 проц.—здавальняюча.

5 проц.—слаба.

— Гэта ў параўнаньні з мінулымі гадамі вялікае дасягненьне—гаворыць начальнік пункту тав. Хілевіч у сваім справаздачным слове.

Я упэўнен, што калі патрэбна будзе, дапрызыўнікі 1905 году Менскага вучастку, будуць не на апошнім месцы.

Гучнае „ура", якое зьлілося з гукамі Інтэрнацыяналу, заглушае апошнія словы начальніка.

Ад акругкому ЛКСМБ перадаў гарачае прывітаньне дапрызыўнікам тав. Маслоўскі.

—Уся Менская Акруговая Комсамолія сьвяткуе разам з вамі.

— Мы радуемся вашымі дасягненьнямі.

— Мы сёньня выпускаем 96 дапрызыўнікаў комсамольцаў, якія былі прыкладам у вашай працы.

Яшчэ выступіў сакратар комсамольскага калектыву пункту — тав. Шындэраў.

Але з асаблівым уздымам сустракалі дапрызыўнікі сваіх камандзіраў.

Гэта гаварыла аб тым, што дапрызыўнікі з камандзірамі ў кароткі тэрмін вучобы з'ядналіся ў адну сям'ю

Да позьняй ночы зацягнуўся вечар.

Р. ГОЛЬДЗІН.



Вынікі нашай працы. (Вучэбны пункт Менскага вучастку).

Комсамольскі колектыў нашага дапрызыўнага пункту складаўся з 96 чалаек. З іх было 46 партыйцаў.

Бюро колектыву зразу ўзялося за організацыю пастаноўкі па за школьнай працы сярод дапрызыўнікаў. Для вясковых хлапцоў, якія знаходзіліся ў казарме былі організаваны два політычныя гурткі і праведзены дзьве экскурсіі. Адна экскурсія была ў першую дзяржаўную друкарню, а другая ў дом санітарнай асьветы.

* * *

Г. Магілёў).

На нашым дапрызыўным пункце было больш сотні чалавек.

Заняткі ішлі як належыць, хлопцы з вялікай энэргіяй і зацікаўленасьцю вывучалі вінтоўку, строй, займаліся фізкультурай, набівалі політычныя веды.

У часе перапынкаў дапрызыўнікі жартавалі, сьмяяліся, а ў страю сталёвая дысцыпліна. Камандзіры добра адносіліся да хлапцоў, адчувалася адзіная сям'я была цесная спайка.

Трэба сказаць, што вучоба на дапрызыўным пункце дала нямала карысьці і ведаў нашым хлапцом.

Дапрызыўнік Янка Шаірка.

Экзамен вытрымалі. (Крупскі раён, Барысаўшчына).

З 1-га сьнежня ў нашым раёне праводзілася чарговая дапрызыўная падрыхтоўка.

На Крупскі вучэбны пункт сабралося 250 чалавек. Характэрна адзначыць, што процант спазьніўшыхся на вучобу вельмі нязначны і праца на пункце пачалася па плану, строга ў вызначаны тэрмін.

З першага дня вучобы мы ўзяліся за афармленьне комсамольскай групы. За месяц былі праведзены 3 сходы комсамольскай групы; кожны дзень працавала бібліотэка і чытальня. Сіламі дапрызыўнікаў было пастаўлена тры спэктаклі, налядзілі політ-рулетку, якою ўсе былі вельмі зацікаўлены. Політрулетка выявіла, што наша сялянская моладзь, параўнаўча з мінулым, політычна значна вырасла.

Комсамольская група ўзяла так сама на сябе працу па політычнай вучобе на пункце. Яна вылучыла трох комсамольцаў групаводаў.

Месячная ўпартая праца над набыцьцём вайсковых ведаў дала дадатныя вынікі. Гэта адзначыў і начальнік вучэбнага пункту у сваім дакладзе аб выніках вучобы. З 250 дапрызыўнікаў добра і здавальняюча вытрымалі 228 чалавек.

У часе вучобы на пункце зусім адсутнічала рэзкае парушэньне дысцыпліны і этыкі. Дапрызыўнікі Крупскага вучэбнага пункту праявілі максымум вытрыманасьці, акуратнасьці і дысцыплінаванасьці.

У выніку трэба адзначыць добрыя, таварыскія адносіны паміж камандзірамі і дапрызыўнікамі. У працягу цэлага месяцу гэта была адзіная, цесная злучаная сям'я.

С. Львоў.

Вучоба прашла вельмі ўдала. (Койданаўскі р. Меншчына).

Дапрызыўная падрыхтоўка ў нашым раёне прашла надзвычайна добра.

1-га сьнежня дапрызыўны пункт зьвінеў сьпевамі і вясёлым гоманам. Шлі з дальніх і блізкіх вёсак—хлапцы з клумачкамі, ў шэрых сьвітках, кажушках.

Усе гэта паказвала па тое, што вучоба будзе ісьці пасьпешна.

І праўда—дапрызыў прашоў надзвычайна удала. Хлапцы ня толькі добра вучыліся па вайсковай лініі, але і прымалі актыўны ўдзел ў грамадзкай працы пункту.

Пры пункце была адчынена чытальня, дзе мелася шмат газэт і рознай літаратуры.

Дапрызыўнік.

Першымі ў вучобе (Касьцюковіцкі вучпункт, Калінішчына)

Ня гледзячы на тое, што комсамольцаў на вучпункце было ўсяго 25 чалавек яны змаглі шырока разгарнуць выхаваўчую працу.

За кароткі час вучобы на вучэбным пункце была выпушчана насьценная газэта, пастаўлена некалькі спэктакляў. Сярод дапрызыўнікаў праведзена кампанія за падпіску на газэты. (Завярбована 86 падпісчыкаў).

Трэба адзначыць, што і на вучобе комсамольцы былі першымі. На вечары вайсковых дасягненьня большасьць прызоў атрымалі комсамольцы.

Трэба сказаць, што дапрызыўная падрыхтоўка шмат карыснага дала нашым хлапцам. ДАПРЫЗЫЎНІК.

Сумна, таварышы, сумна!

«И скучно, и грустно,
И некому морду побить...»
(Амаль што Надсон).

Гэта гучыць крыху дзіўна: зіма і... сумна!

На вуліцы бадзёры студзеньскі мароз, вецер румяніць шчокі, вясёлы сьнег сьпявае пад палазамі срэбныя сьпевы, хлопцы ляцяць на лыжах і каньках, поўносяцца санкі, заліваючыся бубенчыкамі, на ячэйках мала засіджваюцца (холадна), доўгія прамовы не гаворацца (холадна), адным словам усюды прыгожасьць і раздольле—і на табе—сумна! ..Як, чаму? Да вось, сумна—і „никаких гвоздей"!.. Вы ня думайце, што я кажу аб беспрытульных. Ім, зразумела, ня вельмі весела ў гэткую сьцюжу, але яны —бывалы народ! Нахукаюць на пачырванеўшую лапу, закруцяцца на адной назе і „наперакор стыхіі" выпаляць удалую частушку:

«Як у мэй мілочкі
Усе ат ядь бутылачкі...
Ваней горкага віцця—
Дам-па-дры-ца-то па-па!»

Гутарка тут ідзе аб іншых людзях. Аб тых, якія стаяць цэлымі днямі ля печак, грэюць невыказнае месца і стогнуць:

— Су-у-мна... Чаму гэта так сумна?.. Ой, як сумна!...

І калі ў горадзе можна ад сумоты прачытаць томік Есеніна, альбо выпіць у цёплай кампаніі, дык у вёсцы—і таго няма... Проста— кладзіся ды памірай! Асабліва кепска прыходзіцца вясковаму настаўніку. Уявіце сабе: сьнег, глуш, ніякай культуры, ніякай кампаніі... Звар'яцець можна! Адзін сродак пазбавіцца ад сумоты—ляпнуць каму небудзь ў морду. Але .. каму? Вясковыя хлапцы ўсе, як на падбор—здаравенны народ—паспрабуй, суньсял! Яны, братка, так цябе пачастуюць, што ўся сумота к чорту выляціць, а твар стане крывавай маскай... Гэта не пажадана. Тыя, каму сумотна — народ дэлікатны, з імі нельга так абходзіцца. І вось паўстае пытаньне: як тут быць? Як пазбавіцца ад праклятай сумоты?

Калі гэтае пытаньне стала перад настаўнікам Бранчыцкай школы (Слуцкая акруга, Старобінскі раён) таварышом Раманіным—ён яго ніяк ня мог разьвязаць. Доўга мучыўся і страдаў тав. Раманін, доўга хадзіў па вузенькаму пакойчыку, лахмаціў валасы, валяўся на зьмятым ложку і пасылаў камусьці праклёны, але пазбавіцца ад сумоты ня мог.

Але ўсяму бывае канец.

Як некалі Архімэд, седзячы ў лазьні нечакана знашоў свой геніяльны закон, так і Раманін, выкладаючы вясковым дзеткам арытмэтыку, раптам вынашоў сродак ад сумоты!

Вынашоў — і тут-жа ўзяўся за справу.

Падышоў да аднаго ружовенькага хлапчука, які ў гэты момант боязна выводзіў на дошцы $2+2=4$, схапіў яго за ільняныя валоскі і кінуў на падлогу... Хлапчук з перапалоху нават ня піскнуў. Ён падняў свае блакітныя вочкі на здаволенага настаўніка, хліпнуў носікам, падумаў крыху, і толькі тады ціха заплакаў. І разам з гэтымі нявіннымі сьлязьмі Раманін адчуў, як яму становіцца ўсё лягчэй і лягчэй, як прападае сумота і сэрца б'ецца радасным боем..

За першым хлапчуком пашлі і другія...

Звярочваючыся дамоў дзеткі падлічвалі каму больш дасталося. У аднаго быў раз біты нос, у другога царапіна на руцэ, у трэцяга разадраная кашуля... А што скажуць у хаце? О, папада е! І зноў на вясёлыя вочкі навярочваліся вялікія, празрыстыя сьлёзы...

Мы атрымалі весткі, што таварыш Раманін ужо не сумуе. Вядома, яго сродак дапамог у гэтым. А нам ведаеце, неяк сумна. Асабліва пасьля таго, як напісалі гэты фэльетон...

Міх. Гольдбэрг.

Літаратурная старонка

М. Хведаровіч

Менск

І гымны і мэлёды ва ўсякага па своему,
Вось толькі я ня ведаю пра што мне заяець.
Ці мне пеяць аб прадзедах
Ці мне пеяць пра новае—
Ці славіць твой на захадзе палаючы маяк.

* * *

Па моему, па простаму, заву цябе сталіцаю,
Ніяк-жа па інакшаму назваць я не магу.
Яшчэ заву чырвонаю—
Савецкаю станіцак—
Любімаю і роднаю і ў цьвеце і ў сьнягу.

* * *

Люблю твае я вуліцы вясёлыя і хмурыя,
О колькі гора горкага твае жыцьцё аьнясло.

Муры твае высокія,—
Высокія, панурыя,
Хаваюць аб мінуўшчыне пагардных многа слоў.

* * *

Таму вясною ў зелені, цяпер у бель асьнежаны,
Такі-ж вясёлы, радасны, — люблю муры твае.
Прышоў к табе я з шэрані—
Прышоў к табе прыніжаны—
Дзе гора, сьветлай радасьці, па своему пяе.

* * *

І гымны і мэлёды ва ўсякага па своему,
Таму-ж і песьня першая, табе, цяпер мая.
Успомню нашых прадзедаў—
І песьняю па моему—
Праслаўлю твой на захадзе палаючы маяк.

Юр. Лявонны

У падшэфную!

Поле, поле...
Гуляе вецер.
Пералескі. І срэбны сьнег.
На марозе жаданьняў
вецьце
Заплялося ў бунтоўным сьне!..
Разгуляваліся ёлак атрады...
Вецер, вецер!
Не рвіся дарма!..
Бо прагоніць кудлатая радасьць
З пасівелых палёў туман!..
Хутка думак
прыстане човен
Да празрыстых дзён берагоў.
Толькі золкі ружовыя пчолы—
Зашнуруюць з усіх бакоў!..
Вось прыехалі—
Стала падвода...
Скрозь па вёсцы відаць агні...
І юнацкая радасьць—
На ўзводзе,
І на струнах—
гудзяць аваднІ..

Я. Панамароў

Зьніклі туманы

Зьніклі туманы,
Зьнікла самота,
Выйду зірну я,
Там, дзе чароты...
Выйду ў прасторы
Срэбных палёў
Белай пялёнкай
Сьнег там палёг...
Бельлю спавіты
Прасторы зямлі,
Зімнія сьцюжы
Зямлю спавілі...
Сьнег серабрысты
Лёг бы крышталь,
...Думкі, бы коні,
Імчацца ў даль...
Поле... балота...
Зімні абшар...
Сьнегам пакрыты
Летні папар...
Бельлю спавіты
Прасторы зямлі,
Зімнія сьцюжы
Зямлю спавілі...

Пятрусь Глебка.

Памяці У. І. Леніна.

Сядзіць стары, лучына тлее,
кругом унукаў чарада.
Зіма за вокнамі бялее,
бялее ў дзеда барада.
— «Аб чым сказаць, мае вы кветкі,
у гэты дзень жалобны дзень?
Маё жыцьцё разьнесьлі ветры
І толькі дзень адзін цьвіце.
— Аб чым сказаць у дзень жалобны,
— калі ня стала Ільліча?
— А вось... сягоньня ўспомніў«...
І дзед р сказываць пачаў.
— Ня знаў з маленства радзімых, гон й,
як вол на пана працаваў.
Як ліст, каторы ветры гоняць,
таптаў чужыншчыны дзірван.
Ганяў пльты, на'т, быў у Сібіры..
чаіх шляхоў я не таптаў?
Чыіх пяскоў, калючых жвіраў,
сваёй сьлязою ня ўбіраў?
— Я помню ён—Вялікі Ленін—
прыжмурыў вока на трыбуне
казаў.. а сэрца неяк млела
пасьля ўздымала ў грудзях буру.
засыплюць скора мяне жвірам..
Я не забудуся ніколі
тых слоў вялікіх—Уладзімера.

Васіль Каваль.

Сінеючая даль.

* * *

Раніца...

Залацістa-туманная, з ружовымі вачмі-праменьнямі, у чырвонах кудрах з вянком—маладуха... скачыць на маладым сьнягу мяцеліцу.

Роднае поле...

Поле, агарнутае белым пухам.

А па сьнежнай коўдры раскідаліся хаткі. Дым з комінаў шырокімі хвалямі нясецца да сінеючай высі.

Эх!.. У сінякудрую раніцу я разь вітаўся з вёскаю і—вецер панёс— далёка...

далёка...

Мая хатка—старая бабуля—няпрыветна зірнула дзьвума чорнымі прыталкамі і, здаецца, аб нечым пашкадавала.

З торбай за плячыма, з кіем у руках у сьвіце—павяла мяне лясная дарожка да станцыі.

Сьнег пад нагамі скрыпеў. Лес ціханька гаманіў. Дарожка вілася белаю істужкай...

Зубры.—Паўстанак.

Рэйкі далёка вядуць і сходзяцца там—далёка. Дрот на стаўбах пяе,— нясе невядомыя думкі.—Ці не маю гэта ён панёс?

Заступамі разграбаюць рабочыя сьнег ад шпал. Вясёлыя яны. Аб нечым гавораць і сьмяюцца...

У хаты, куды я зайшоў,
у белых сярмягах, у лапцях—дзядзы з нейкай думкай у пабялелай галаве чакаюць...

Захахатаў па вуліцы другі званок. Устрапянуліся. Дрыжэлі рэйкі, цягнік рваўся пускаючы і акутваючыся пярсьцёнкамі дыму.

— Трах-тах тах!..

Гудзіць цягнік, вядзе няскончаную песьню. Часамі вырываецца рэзкі сьвіст, што аж глушыць.

Пазіраю ў вакно.

Нясуцца назад узгоркі, шэрыя вёскі, лясы і гаі; курганнае поле, адзінокія хаткі—

вобразы Беларусі.

Два дзядкі шамкаюць—гавораць:

— І ў мяне-ж гэтак сама сын— комсамолец! Прымушаем богу маліцца, дык не, няма таго, каб сходзіць у царкву ў нядзелю, дык ён ідзе на сход... Бяда з імі!

Словы-кісель цягнуцца з пад махавой барады. Качае галавою, балюна, з надломам сьмяецца, цягне:

— А работнік добры... Бадай што адзін усё пакасіў. Хварэў я ў гэта лета.

Доўга гамоняць—плачуцца над новым сьветам старыя людзі.

— Не, мне з імі ня плакаць!

Думкі туманамі завалаклі галаву. Ніткамі цягнуліся і пяляліся ў адзін вялікі клубок.

Адчуваю, што цягнік яшчэ шпарчэй пашоў.

Тады неяк жыцьцё адначасна зарытмавалася з гэтым цягнікам, што бяжыць у сінеючую даль.

І я таксама на хвалях жыцьця нясуся ў тэту даль.

На крыльлях маладосьці імкнёмся ў невядомае, нешта цягне, каб адным абыймам захапіць.

Хочацца працаваць!

— Працераблю сьцежкі!

— Адшукаю шляхі!

— Трах-тах-тах! — пеў цягнік, рваў думкі ў дысонанс пачуцьцям.

* * *

І ненарокам успомнілася вёска і песьня.

„Я ў гародзе, я ў гародзе
рожу палола...
Аааа-й далінаю, далінаю—
рожу палола.

Пелі гэту песьню дзеўкі ў супрадках, пад грабянямі. І матыў яе быў такі журбочна-вясельны, што і цяпер захаваўся ў памяці, пранік у істоту душы...

Тады шэрань павісла кавалкамі на цёмных вокнах. Усхліпваючы гарэў аганёк лучыны. Пелі многа песень. І ўсё пра цьмяное жыцьцё вёскі, пра ласкі жыцьця... І, здаецца-б, вечна слухаў іх...

... Дні прыгожага лета...

Белабрысае сонца рагоча ў сіняй высі жоўта-чырвонымі касьнікамі-праменьнямі. Заплятаюцца яны ў касу маладзіцы-восені. Апавілі поле, запелянал і вёску.

Заколыхаліся вечарам соннай смагай кучараватыя бярозкі, разам з песьняй з жней нагулі жніўныя песьні. А песьня-дзіўна-чароўная вясёлая, ды з таемным смуткам—зашнуравала ў вёску. Заколыхаў зорны вечар думкі. Абыймаліся яны з песьняй...

Зіна прытулілася к майму плячу. Вечар урываўся ў душу. Мы ўспаміналі нешта—

радаснае,

маладое.

Няма кволасьці, няма журбы...

Радасьць калыхала думкі, як лісьце клёну, пад якім мы сядзелі. Тады шэрымі ніткамі пацягнуліся дні. Гэта быў апошні вечар. Я ехаў далёка—ў горад...

І застался ў памяці — смутна, няясна і шчыра:

— Вёска,
песьні
і Зіна...

А цяпер—я ў горадзе.

Многалюдны, гаварлівы праглынуў у сваім гомане. Закінуў у вір і ўсьлед застаў грукатам.

А заводзкі гудок гучна заляскаў-прагудзеў.

Гарадзкі звон—
Грукат жалезны,
трывожны, з буйнай радасьцю.
Вядуць шырокія сьцежкі.
А за горадам—
сінеючая даль...

Валеры Маракоў.

* * *

Цяпер у грудзёх другія словы,
Другая боль у душы жыве.
І гэты сьпеў бадзёра-новы
Да сьветлай праўды сьвет заве.

Зьвятае сон... Мне крыўда...
Вясна мне глянула ў вакно.
Цяпер пад сонцам ў поле выйду,
Куды хацеў ісьці даўно.

І там над рэчкай і над полем
Я вып'ю новую зару,
Каб песьняй радасьці і волі
Праславіць сьвету Беларусь.

Каб гэты сьпеў бадзёра-новы
Разьвеяў крыўду і туман,
Бо зноў цьвітуць прывольля словы
І лепшых слоў у жыцьці няма!

Міх. Багунец.

Узімку

Не цьвітуць надзеі,
Не красуюць сны,
Я чакаю новай
Радасьці—вясны.
Белаю зімою
Усё пад сьнегам сьпіць,
Завіруха хоча
Сьнегам усё абвіць
Гаць, балота, нівы,—
У сьнежнай белі сьпяць,
Толькі бор шумлівы
Хоча штосьць сьпяваць.
І шуміць ён глуха,
Штосьці кажа мне:
Шэпча мне на вуха
Казкі аб вясьне.
Думкі мне навеяў
Шум сівых бяроз...
А вакол завеі
І скрыпіць мароз.
У песьнях завірухі
Нікнуць чары—сны;
Я чакаю новай
Радаснай вясны.

Зьм. Астапенка.

* * *

У блакітным, у прасторы
Засінеліся казкай зоры.
Засінеліся казкай зоры
І ў душы бы хвалі ў моры
Думкі роем сплясьнуліся.

І ў блакітнай сіняй далі
Завіваліся ў каралі
Завіваліся ў каралі,
Што ні час—мацней сьпявалі
Словы песьні незнаёмай.

І пад струнаў перазборы
Ажылі ў ёй казкі зораў,
Ажылі ў ёй казкі зораў,
Шэпты цьмянага прастору
І бадзёры дух юнацкі.

І цяпер вось думкай тою
Я ганяюсь за вясною,
Я ганяюсь за вясною
З нестрымана ю хадою
З песьняй—думкай заліхвацкай.

Аб творчасьці „пачынаючых“.

Тэматыка ў вершах „пачынаючых“. Разяўленыя ножкі дзьвух бакоў творчасьці—тэматыкі і формы. Аб сьпісваньні «Думаніна» у вершах. Ці можна навучыць кожнага чалавека пісаць вершы. Пра вершы і «вершы» іх пісьменнасьць «пачынаючых» і перакручваньне думкі.

З глухіх куткоў Мазыршчыны, з паўночнай Беларусі — Віцебшчыны і Полаччыны, з беларускай „Камчаткі“—Калінiншчыны лятуць проста ў Менск, у рэдакцыю, цэлыя кіпы вершаў, вершыкаў, поэм, поэмачак, апаведаньняў... А больш за ўсё — вершаў.

І складаюцца яны ў рэдакцыі ў шуфляды, чакаючы доўгачаканага адказу на іх, альбо зьмяшчэньня.

Калі прыходзіцца праглядаць гэтыя сотні вершаў, дык бачыш які шырокі размах пяра ў тварца іх — моладзі, рабочай моладзі, сялянскай моладзі!

Тэматыка самая найрознастайнейшая: мінулае Беларусі, сучаснае жыцьцё ва ўсіх праявах; Кастрычнік, Май, Ленін, Комсамол і Маладняк і дзень вызваленьня Беларусі з пад белапольскай окупацыі; паўстанцкія матывы з часоў акупацыі, гімны Беларусі, прыродзе, насельніцтву; заклікаючыя падбадзёрваючыя песьні братам Заходняй Беларусі, імкненьне да навукі—у горад, на рабфак, малюнкі быту ў вершаванай форме, лірыка каханьня і г. д. і г. д.

У тварца вершаў—моладзі надзвычайна багаты колёрыт думак. Але з другога боку гэтыя думкі нашая моладзь ня можа „выплескаць“ на паперу, так як хацела б яна. А пісаць хочацца. І піша. Недарма адзін з пачынаючых склаў верш:

„Дык прызываю я вас усіх
Да ручак і паперы,
І пачніце ўсе пісаць
Без канца і меры!..

І што-ж у выніку? Пішацца „без канца і меры“, а якасьць, якасьць... проста аж пра яе і гаварыць ня хочацца...

Праўда на гэта зьявішча маюцца і прычыны. Адна з іх—адсталасьць, культурная адсталасьць нашага народу—а з другога—вялікае абуджэньне да творчасьці. А ў выніку—разяўленыя ножніцы сьціснуць якія зможа ня хто іншы, як толькі сама пачынаючая пісаць моладзь, праз падняцьце свайго культурнага ўзроўню, праз навуку. А прыпіскі на вершах: „Калі што ня добра, дык даруйце, бо я малапісьменны“ справы—ня выратуюць.

II

„...Я ня буду скардзіцца на вас за тое, што не дапусьцілі ў газэту маіх вершаў, я добра знаю наколькі яны яшчэ слабыя, але мне няма часу над імі сядзець ды доўга думаць. І вось я буду слаць вам новыя вершы, можа які з іх і удастоіцца быць надрукаваным у газэце...“—так піша адзін з „пачынаючых“ у нашу рэдакцыю, і разам з лістом шле чарговыя вершы. Чытаю верш „Прыгоўным Захаду:“

„Паўстаньце, з гнёту і няволі,
Скідайце з плеч свах ярмо,
Даволі гнуліся, даволі
Пара к свабодзе ужо даўно.

Прыводжу ўрывак з „Інтэрнацыяналу“:

„Паўстань, праклядцьцем катаваны
Паўстань, хто з голаду век пух
Бурліць наш розум збунтаваны,
Няволі кліча рваць ланцу!

Ну, хто ў каго сьпісаў? Зразумела той, хто пісаў апошнім. А пісаў апошнім наш „пачынаючы“—таму можа ён і несьвядома, а сьпісаў, пераказаў той жа сэнс, толькі іншымі крыху словамі. А ўсё з за таго „што доўга думаць—няма часу“—па яго нашаму выразу, а па нашаму тут і думаць доўга нятрэба, а толькі запытаць у сябе—ці ня чуў я таго-ж самага, пра што я напісаў? І адказ безумоўна будзе знойдзен, калі „пачынаючы“ добра праверa сваю памяць.

А цяпер аб „думаніне“. Мне надоечы прышлося даведацца, што ў адной з беларускіх профшкол добрая палова вучняў—адно толькі і робіць, што „думае“ як бы гэта напісаць верш. На „думкі аб вершах“ трацiцца шмат часу, хлапцы злуюцца, ламаюць перы і ў іх нічога ня выходзіць, а калі „што“ „хто“ і „надумае“—дык адразу перасылаецца „даплатным“ у рэдакцыю, а там падбаўляецца да „ненадрукаваных“—толькі

Верш не зьмяшчаецца — хлапцы злуюць (добра, што хоць адзін піша „што ня буду скардзіцца“).

Тут выходзіць простае непаразуменьне. Нават гэтае непаразуменьне даходзіць да таго, што хлапцы пішуць: „дарагая рэдакцыя навучы мяне пісаць вершы, бо пакуль што я не навучыўся пісаць іх“(!!!). Навучыць чытаць—можна, пісаць—таксама, спэцыяльнасьць якую набыць—таксама можна навучыць, але выбачайце, навучыць пісаць вершы кожнага чалавека—нельга! І хай хто колькі хоча «думае“, а раз бачыць, што творчасьць яго не пасоўваецца наперад, вершы не друкуюцца — дык простая парада: кінь пісаць вершы, бо карысьці будзе мала.

Да рэчы аб вершах і „вершах“. З за сваё няпісьменнасьці, малапісьменнасьці „пачынаючыя“ ставяць перад сабою адну ўмову перад пісаньнем: каб толькі апошнія словы радку былі напісаны ў рыфму—і верш гатовы. Выбачайце, Ня ўсё тое, што напісана ў рыфму зьяўляецца вершам. Вось прыклад:

„... Восем год ужо мінула
Як дзень нам гэты стаў сьвяты
Бо фундамант Комсамола
Звалі ў яго брыты“.

(Вязьмежны)

Гэта верш ці не? Безумоўна не. Звычайная проза, якую мы чытаем у артыкулах з газэт, з допісаў, ды другі раз і артыкул (ня кажучы аб мастацкай прозе). напісаны куды лепш за гэты „верш“. А вершы тым і розьняцца ад звычайнай прозы, што неадменнай іхняй адрозьненасьцю зьяўляецца мастацка-выказаная думка, маючая адпаведную зьместу форму, музычнасьць, мілагучча—разьмер. Значыць таго, што ў першым радку ў апошнім слове стаіць «ла» і ў трэцім радку «ла», а ў другім і чацьвертым (сьвя).„ты“, (ора) „ты“—мала. На выдрукаваных, хоця-б сёньня ў літаратурнай старонцы вершах кожны пачытаючы можа гэтую адрозьненнасьць заўважыць.

Тут-жа спынімся і на „пісьменнасьці“ нашых „пачынаючых“. Мала таго, што ў вершах вельмі часта сустракаюцца не беларускія словы, у той час калі ў беларускай мове маюцца адпаведныя беларускія словы, вершы пішуцца няграматна і з боку пабудовы сказу—думкі. Думка для рыфмы перакручваецца на лад „пачынаючага“ так, што другі раз проста цяжка ўявіць чытачу аб чым ідзе гутарка.

І. Л. Б.



Маладыя Ленінцы ажыцьцяўляюць задачы Ленінскай партыі

Нарада комсамольцаў-гаспадароў пры Магілеўскім Акругкоме ЛКСМБ ад 10 студзеня 1927 г.

Комсамольская гаспадарка павінна стаць асяродкам агрономічных ведаў у весцы

Новы кавалак вопыту

(Уражаньні ад нарады)

Скрыпучы палазамі нашы сані ўсё далей рухаюцца ўпярод. Мароз дае сябе адчуваць, ад ветру міжвольна адварочваешся. Едзем у двох з агрономам.

Абодвы жадаем аднаго:—хутчэй прыехаць, пабачыць што маецца.

Мы ў гаспадарцы Міхася Тарасенкі. 18-ці гадовага комсамольца, які вядом Комсамолу Беларусі як культурнік-гаспадар.

Абгледзелі маемасьць, гаспадаркі досыць пагутарылі.

У гэты дзень у весцы Бракава выбіралі сяброў сельсавету. Шмат сялян заходзілі да Тарасенкі, да гаспадара культурніка. Тарасенка-новы дарэгі культурнік. Ен пазычыць добрага насеньня. Яму за яго ня прыдзецца „адрабляць з працантамі". Сярод зайшоўшых—адзін са статутам агнятрывалага таварыства: такое трэба організаваць, каб гэта зрабіць—неабходна з Міхасем пагутарыць.

У Міхася Тарасенкі ёсьць бацька Ен здаровы. Але ж гаспадаром зьяўляецца сын Міхась.

Матка кажа:—ад нас на перавыбары пойдзе Міхаська. Ен у нас усюды.

Уплыў комсамольца Тарасенкі на сям'ю вельмі адчуваецца. Культурныя пачаткі ў гаспадарцы ведае сарака гадовая матка, не падкачае у гэтым і дзесяці гадовы „каракуз".

Ціха сур'ёзна і спакойна праходзіла нарада самастойных гаспадароў - комсамольцаў пры акругкоме Комсамолу.

На нарадзе два гаспадары—дакладчык; два агрономы—садакладчыкі. Усё перабрана, усё абгаворана. Тарасенка Міхась—у асяродку увагі.

Комсамолец Дранькоў, праўда з з серадняцкай гаспадаркай таксама рухаецца ўпярод. Гэтаму дапамагла, як ён кажа, тое што ён—комсамолец.

Адчуваецца і праца школы сялянскай моладзі. Ад яе ёсьць дасягненьні ня толькі ў сэнсе атрыманьня вучнямі вед, але і ў практычнай працы вучняў на сваіх гаспадарках. Асабліва гэта назіраем у гаспадарцы Конюхавай.

* * *

На нарадзе мы „сьпеліся" з агрономіяй. Гэтай нарадай мы ўносім новы кавалак вопыту ў нашу штодзённую конкрэтную працу.

Агрономія на ёй убачыла, як комсамалята „забаўляюцца" з зямлей. Агроном Балалаў ня робіць памылкі калі кажа: —„што нам за карысьць з 40 дзесяцінных? З гаспадаркамі комсамольцаў—мы кожнаму адкажам што магчыма зрабіць на іх 4-5 дзесяцінах!"

Г. Фалкін.

Комсамольцы-гаспадары аб сабе

Тарасенка Міхась

(Вёска Бракава)

—Нельга казаць, што мае дасягненьні надта вялікія, але ж наша гаспадарка расьце. Напрыклад: дрэнная сенажаць, якую ніхто не жадаў браць, мною паляпшаецца. Будынак адчаўляецца. Замест разваленай хаты, пабудавалі добры будынак, а другі—аўчарню. Мы вельмі жадалі ў гэту зіму перайсьці ў новую хату і перагнаць жывёлу, але-ж адчуўся недахоп сродкаў.

Сельзварот нашай гаспадаркі

Мы завялі шматпольле. Чарговасьць у культурах наступная: папар, азімна, бульба і карняплоды, канюшына, яравыя. Я дабыў сарты раўнае насеньне. Пшаніца—высока літоўская, якой у мяне было ўсяго 27 хунтаў, дала 11 пудоў. У леташні год я засеяў 20 кв. сажон канюшыны з атавай. У маей гаспадарцы маюцца вопыты. У 1926 г. залаканы пад жыта 7 дзялянак, з якіх кожная мае 30 кв. сажон. Адна дзялянка пад гноем, другая пад торпам, 3-я пад лубінам, 4 я—кантроль, 5 я—тамашлак, 6 я—супэр фосфат і 7-я—тамашлак з салітрай і каліннай сольлю. Былі вопыты вымачваньня насеньня у рашчыне.

Таксама павысілася заробчая плата моладзі, калі ў мінулым 1925 26 годзе вучань атрымоўваў у школе 22 руб., дык у сучасны момант—26 руб., у вытворчасьці атрымоўваў 35 р., а ў сучасны момант—45. Заробчая плата значна павышана, але і тут ёсьць цэлы шэраг недахопаў з боку адміністрацыі напрыклад: не дапушчаюць практыкантаў школы да 100 процантнай выпрацоўкі.

Ёсьць таксама хлапцы, якія працуюць у вытворчых нарадах, іх налічваецца 3 чалавекі Але адзін асноўны недахоп гэта тое, што ім практычнай працы не даручаюць, а больш тэхнічную (перапіска пратаколаў і г. д.) Наогул маецца цэлы шэраг недахопаў напрыклад: маса комсамольцаў мала ўцягнута ў штодзённае практычнае разьвязаньне пытаньняў вытворчага характару, слабое наведваньне вытворчых нарад комсамольцамі, яшчэ не дабіліся таго, каб высунутае пытаньне сапраўды знаходзіла падтрымку з боку адпаведных органаў.

Удзел колектыву ў грамадзкім жыцьці

Параўнаўчы з мінулым мы ў сучасны момант маем некаторыя лічбы, якія гавораць аб дасягненьнях у сэнсе ўдзелу комсамольцаў у грамадзкім жыцьці. Такога актыву налічваецца 14 чалавек. Працуючых у мясцкоме маецца 2 чалавекі, у рэвізыйнай камісіі адзін чалавек, у Учпрофсожы 2 чалавекі, у праўленьні коопэрацыі 1 чалавек і цэлы шэраг другіх галін працы (дапамога дзецям, авіахім і інш). Адным з недахопаў трэба лічыць, што яшчэ да гэтага часу не ўстанавілася нармальнасьць адказнасьці перад бюро высунутых таварышоў, работа гэтых таварышоў у большай частцы ідзе самастойна.

Баявая задача—мець добрую жывёлу

Мець добрую жывёлу неабходна і магчыма тады. калі маецца досыць сродкаў. Але ж мы ў гэтым напрамку зрабілі ўсе, што магчыма. Хлеў будаваўся згодна пляну, удзеленаму мною у Акруговага жывёлавода, але-ж нам не ўдалося ў гэту зіму перагнаць жывёлу ў новы хлеў. У нас у гаспадарцы маецца адна карова і двое цялят. У лік корму даем жмыху і вотрубі.

Кормім таксама вікай з аўсом. Быў у нас і бык-праізвадзіцель, які за 1926 год пакрыў 26 матак. Быў кныр, які прызнан зоотэхнікам ёркшырскай пароды, які пакрыў 11 матак. Мы яго прадалі і узялі 81 рубель. Наогул, сьвінаводзтва у нашай гаспадарцы пастаўлена добра і значна дапамагае павялічэньню каштарысу гаспадарцы.

Мая дапамога суседзям

У нашай вёсцы вельмі багата балота. Большасьць нашай сенажаці—балота. Два гады мы мучыліся на гэтай сенажаці. З усяго балота наша гаспадарка атрымала—2811 кв. саж., дзе ў мінулым годзе праведзена карэнная меліорацыя дзе прарыта канава ў 300 сажон. У гэты час балота значна высахла. Я на балоце зрабіў досьледы.

Наша гаспадарка уплыў робіць на другія гаспадаркі. 11 гаспадарам мы давалі і збожжа. Нашага кныра і быка грамадзяне скарыстоўвалі бясплатна. З 190 гаспадарак нашай вёсцы знойдзецца вельмі мала, якія не скарыстоўвалі нашага быка. У гэтым годзе я даў 3-м гаспадарам канюшыну.

Сьвядомае паляпшэньне гаспадаркі.

(Содаклад агронома т. Балалава, які абглядаў гаспадарку Тарасенкі).

Ня гледзячы на засуху, гаспадарка Тарасенкі мела добры ўраджай. Зерно вельмі добрае, якога я яшчэ ні бачыў у гэтым годзе. Досьледы Тарасенка робіць на падставе ведаў атрыманых шляхам чытаньня агрономічнай літаратуры.

У галіне жывёлагадоўлі, яго дасягненьнямі зьяўляецца тое, што ён пабудаваў добры хлеў на ўсю жывёлу. Жадаў ён зрабіць дацкія кармушкі, але-ж я яму раіў зрабіць расейскія. Карова Тарасенкі звычайная „беларуска", але-ж высокай малочнасьцю—дае 35 фунтаў малака.

Трэба зазначыць, што ўся сям'я Тарасенкі імкнецца к паляпшэньню гаспадаркі і ўсе сябры сям'і зацікаўлены ў атрыманьні агрономічных ведаў.

Гаспадарка Тарасенькі зьяўляецца прыкладам у раёне і праца ў ёй праводзіцца вельмі добра.

Тав. Дранькоў.

(Вёска Цішоўкі).

— Глеба наша да 1925 году была пад лесам, які ў час вайны быў зьнішчан на акопы. У 1917 годзе зьявілася магчымасьць гэта месца скарыстаць дзеля пахаты. Будавацца пачалі з 1917 году і скончылі у 1922 г. Бацька памёр і мне засталіся толькі хата і клець, з чаго я і пачаў працаваць і падымаць на вышэйшую ступень сваю гаспадарку. У 1925 годзе я уступіў у Комсамол і толькі з гэтага часу мая гаспадарка пачынае бачыць новае. Я пачаў сеяць канюшыну (кожны год 3 пуд.). Маю чотэктыўную вежку і сячкарню.

Маю 2 каровы, кабылу і каня, але-ж добрага хлева для іх няма.

У гэтым годзе я быў на выстаўцы, якая яшчэ больш падняла мой энтузіязм у падняцьці сельскай гаспадаркі.

Перашкодамі для маёй працы зьяўляецца: хутарская система і адсутнасьць студні

Добрыя пачыны.

(Садаклад агронома тав. Караля).

— У гаспадарцы Дранькова—6 дзесяцін пахаты, 2 дзесяціны сенажаці, агарод і сад, гаспадарка сярэдняя і мае перспэктыву для далейшага павялічэньня.

Палявых дасягненьняў няма. Сартавых сямян у гаспадарцы Дранькова няма, але-ж гаспадарка яго лепей за ўсіх забясьпечана кормам, дзякуючы раньняму травасеяньню.

Гаспадарка Дранькова мае жывёлагадоўчы ўхіл. Рабочыя коні ў яго добрыя і адна карова племянная. Добрыя сьвіньні.

Мы, агрономія, павінны адзначыць, што комсамольскія гаспадаркі будуць мець значны уплыў пры культурным пабудаваньні іх на астатнія гаспадаркі сялян, бо комсамольскія гаспадаркі сябе „плотам не абгараджваюць". Агрономія павінна больш зварачваць увагі комсамольскім гаспадаркам.

Атрыманыя веды ў школе прасоўваем у жыцьце

(Выступленьне вучня ШСМ т. Конюхавай)

— Мая справаздача будзе аб тым, што я зрабіла ў час адпачынку са школе на сваёй гаспадарцы. Як адпускалі на адпачынак улетку, я па заданьню выбірала попел і скарыстоўвала яго на агародзе. У час зімовага адпачынку я ўцяпліла хлеў карова раней даваўшая 5 фун. малака пачала даваць—6 фун. Раней мы семя не вазілі нікуды чысьціць, а цяпер праводзім ачыстку ўсяго насеньня.

Спрэчкі будуць надрукаваны ў чарговым нумары



Міжнароднае становішча.

(Агляд за бліжэйшы час).

Барацьба Кітаю за свае вызваленьне.

Вайна за вызваленьне Кітаю ад эксплёатацыі ангельскіх капіталістых зацягнулася на доўга і канец яе прадбачыцца толькі тады, калі рэволюцыйны Кантон сілаю аружжа канчаткова прагоніць замежных калёністых.

Перамовы, якія адбыліся нядаўна паміж ангельскім і кантонскім прадстаўніком станоўчых вынікаў не далі. Ангельшчына бачачы недалёкі канец свае эксплёатацыі Кітаю, думала зрабіць захады з другіх бакоў. Але ўжо мусіць позна. Кітайскі народ добра зразумеў і раскусіў сваіх эксплёататараў.

Сёньняшнія падзеі кажуць, што Ангельшчына прабуе зацьвярдзіць свае правы на кітайскія канцэсіі сілаю аружжа, бо падзеі, якія адбываюцца ў Кітаі ня могуць ня пужаць ангельскую буржуазію.

4-га студзеня, пад напорам паўстаўшых кітайцаў, ангельскія вайсковыя і паліцэйскія атрады пакінулі тэрыторыю ангельскай канцэсіі ў Ханькоў Сьцяг ангельскага імпэрыялізму быў спушчаны. Кіраўніцтва канцэсіі перашло ў рукі прадстаўнікоў рэволюцыйнага ўраду Кітаю. Гэты перамагоют як-бы паслужыў сыгналам у другія мясцовасьці Кітаю. І апошнія весткі кажуць, што такія-ж выступленьні адбыліся ў Ічане, Шасі (Хубей), Чаншы, у Чане і інш. мясцовасьцях, дзе іскнуюць ангельскія канцэсіі. Ангельская канцэсія ў Цьзюцьзяне ўжо пакінута ангельцамі, і з гэтых гарадоў напалоханыя чужаземцы вывозяць сваіх жонак і дзяцей.

Вядома, што такія падзеі ў Кітаі ангельскай буржуазіі не падабаюцца. Бачачы блізкі канец свае эксплёатацыі, Ангельшчына думае выступіць з аружжам, супроць кітайскага вызваленьня. Апошнія весткі кажуць, што к кітайскім межам сьцягваюцца ангельскія вайсковыя сілы.

З Нью Ёрку шанхайскі карэспондэнт „Нью-Іорк-Таймс" паведамляе што ў Шанхай прыплылі новыя замежныя суды, і што робіцца падрыхтоўка да абароны канцэсі. Па словах карэспондэнта, антыкітайская прапаганда ў замежным друку, поўна небясьпечных вынікаў, бо яна іграе провокацыйную ролю Карэспондэнт рэкомендуе Злучаным Штатам рашуча заявіць, што яны ня будуць удзельнічаць у інтэрвенцыі, бо ў іншым выпадку грамадзянам Злучаных Штатаў прыдзецца страдаць ад вынікаў антыангельскіх настрояў у Кітаі. Вайсковыя марскія сілы дзяржаў у Шанхаі і на Янцзыдзяне складаюцца ў сучасны момант з 58 вайсковых судоў, якія могуць выдзеліць 5000 чалавек для высадкі. Па словах „Дэйлі Тэлеграф" замежныя канцэсіі ў Шанхаі будуць забараняцца мясцовымі дабраавольцамі, пры падтрымоўваньні ангельскіх сіл.

З Пекіна паведамляюць, што ангельская канцэсія ў Цзюцзяне эвакуіравана і ахоўваецца кітайскім войскам 6-га студзеня паміж кітайскімі пікетамі і ангельцамі была сутычка. Ангельскія вайсковыя суды адкрылі агонь, і пасьля двух, як-бы халастых выстралаў пікеты зьнікалі. Аднак, кітайцы пацьвярджаюць, што ангельцы стралялі баявымі патронамі. Невядома, як'я-б былі вынікі ад сутычкі, але як паведамляюць, кітайскі міністр Сун-Дзе-Вен, які знаходзіўся ў Цзюцзяне, выступіў з прамовай да кітайцаў на барыкадах, якія былі пабудаваны на мяжы ангельскай канцэсіі, і угаварыў кітайцаў захоўваць парадак і спакой. Прамова зрабіла ўражаньне на кітайцаў і сутычка была зьнішчана. Па вестках „Рэйтэра" ўся замежная калёнія Цзюцзяна, уключаючы французскага і ангельскага консула эвакуіравана на суды. Робіцца падрыхтоўка да эвакуацыі з провінцыі Сычуан 400 ангельцаў і 200 амэрыканцаў.

Голас кітайскага народу, які доўга эксплёатаваўся замежнымі імпэрыялістамі, пачынае пужаць сваіх эксплёататараў. Справу свайго вызваленьня, кітайскі народ зробіць сам.

Польшча супроць Нямеччыны.

Польскі міністр замежных спраў, у сваёй прамове, якую ён зрабіў на „Таварыстве разьвіцьця замежных зносін" у Варшаве, з асобай рэзкасьцю выступіў супроць проэкту абмену Данцыгскага калідору на Мэмель і яго вобласьць. Вядома, па думцы Залескага, Літва і Мэмель самі па сабе павінны дастацца Польшчы і па яго словам „кожны Паляк хутчэй ахвяруе свае жыцьцё, як згодзіцца на тое, каб аддаць хоць адну пядзь паморскай ці Сілескай зямлі. У той-жа час ён рашуча выступіў супроць узбройваньня Нямеччыны, асабліва супроць захаваньня ёю цытадэляў на ўсходняй мяжы.

Упаўне зразумелы нападкі нямецкага буржуазнага друку на польскага міністра замежных спраў. і зразу мела таксама здавальненьне французкай дыплёматыі, дзеля якой выступленьне Залескага, як бы зьяўляецца паказацелем што Польшча зноў перахопіць пад крыло Францыі. Францыя зацікаўлена, каб Нямеччына была на ўсходзе слабейшаю і каб тым самым, былі ўзмацнены позіцыі Французскай саюзніцы-Польшчы. Ангельшчына наадварот, нічога ня мае супроць таго, каб трымаць Польшчу ў сталым страху перад тварам узброеннай Нямеччыны. але за тое яна рашуча выказваецца супроць вывазу нямецкіх машын і варштатаў для заводаў СССР.

Ангельшчына і фашысцкая Італія

Ангельшчына ўвесь час імкнецца да таго і складае пляны, каб мець кіраўнічую ролю ў Эўропе. Яна імкнецца мець падпору ў фашысцкай Італіі, якая пасьпешна адымае ў Францыі ўплыў на розныя краіны Ўсходняй Эўропы. Протэст Югаславіі, з прычыны Італа-албанскага дагавору які ператварыў Альбанію ў калёнію ня даў станоўчых вынікаў. Пад націскам Ангельшчыны ліга нацыі мае намеры зарэгістраваць гэты ўгавор. Побач з гэтым Італія вядзе перамовы з урадам фашысцкай Вэнгрыі адносна заключэньня дагавору, які дасьць права Вэнгрыі карыстацца італьянскай гаваньню Фіўмэ, дасьць Італіі асобныя правы ў Вэнгрыі і забясьпечыць ёй вэнгэрскую дружбу. Побач з гэтым Ангельчшына імкнецца замацаваць свой унутраны фронт і забясьпечыць свой тыл з боку рабочай клясы Яна не пакідае жорстка распраўляцца з гарнякамі, не пакідае выганяць з прадпрыемстваў самага актыўнага рабочага-гарняка, які ўдзельнічаў у забастоўцы.

Ніколі яшчэ так высока не падымалася хваля агітацыі за кампанейскія саюзы і за фіктыўны ўдзел рабочых у прыбытках прамысловых прадпрыемстваў. Ангельская буржуазія пры дапамозе „рабочых правадыроў" і „соцыялістаў" магданальдаўскага тыпу, прымяняе ўсе мэтады распуцтва рабочай клясы і подкупу яе грашовымі падачкамі. Томас, Магдональд і іншыя ім падобныя правадыры, адкрыта аб'яўляюць сябе старонькамі „міру ў прамысловасьці" і абедаючы ў дварцох каралеў прамысловасьці, вядуць з імі перамовы аб спосабах уцягваньня рабочых у „кампанейскія" саюзы, якія павінны зрабіць немагчымымі забастоўкі, і наогул колектыўнае выступленьне ангельскага пролетарыяту супроць сваіх эксплёататараў.

М. Х.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

(У ЦК УсеЛКСМ)

Кіно-конкурс

ЦК УсеЛКСМ разам з Саўкіно і рэдакцыяй „Комсамольскай Праўды“ арганізуе конкурс на лепшы кіно-сцэнары з быту моладзі. Тэма сцэнарыя павінна ахопліваць часы прыкладам 20-га году. За лепшыя кіно-сцэнары будуць ўстаноўлены 8 прэмій. Першая прэмія—500 руб., другая—300 руб. і трэцяя—200 рублёў. У конкурсе могуць прыняць удзел усе жадаючыя.

Комсамольская і піонэрская армія расьце

Па апошніх вестках па ўсёй тэрыторыі СССР налічваецца 65026 комсамольскіх ячэяк, у якіх аб'яднаны 2,079,692 комсамольцаў. Піонэрскіх атрадаў налічваецца 46,842, у іх піонэраў—2.127.000.

За добрага кухара.

Вялікі лік моладзі працуе ў прадпрыемствах Нархарчу (сталоўкі, агульныя памяшканьні). За апошні час на працу сярод гэтай моладзі сталі зьвяртаць увагу, як прафсаюзы так і комсамол.

Нарада комсамольскіх працаўнікоў пры ЦК Нархарчу, якая нядаўна адбылася, вынясла асноўную і важную пастанову па пытаньню аб вучнёўстве.

У СССР існуе ўсяго толькі 2 кулінарныя школы, што, вядома, вельмі тармозіць падрыхтоўку рознага роду працаўнікоў па народнаму харчаваньню. Прымаючы гэта пад увагу, нарада пастанавіла зьвярнуцца да ўраду з просьбаю—адчыніць большы лік школ па грамадзкаму харчаваньню, і ўстанавіць заканадаўчым шляхам браніраваньне падросткаў на прадпрыемствах Нархарчу.

Побач з гэтым нашы організацыі павінны разам з гаспадарчымі органамі шырока разгарнуць працу па організацыі гурткоў кухарскіх вучняў.

Навучаньне і вучнёўства

У мэтах набыцьця вучнямі брыгаднага і індывідуальнага вучнёўства ня толькі практычных вытворчых навыкаў, але і спэцыяльных агульна-адукацыйных і політычных ведаў, праводзіцца абавязковае тэорытычнае навучаньне вучняў, шляхам уцягваньня іх у вячэрнія рабочыя школы, агульна-адукацыйныя і профэсыйна-тэхнічныя курсы і г. д. Там дзе няма вячэрніх школ ці профтэхкурсаў, організуюцца групы для вывучэньня тэорытычных і агульна-адукацыйных прадметаў. Тыднёвы тэрмін навучаньня ў школе і ў групе не павінен перавышаць 12-14 экономічных гадзін. Вучні карыстаюцца падручнікамі школ фабзавуча альбо спэцыяльна купленымі за лік гаспадарчага органу падручнікамі.

На карысьць Балтфлёту.

Згодна загаду Менскага АК ЛКСМБ, клюб „КІМ“ і юнсэкцыі рабклюбаў гораду Менску да 25-га студзеня г. г. праводзяць платныя масавыя мерапрыемствы на карысьць Балтфлёту.

Да нас прыяжджае тав. Крупская

На ўсебеларускі зьезд загадчыкаў хат-чытален які адбудзецца ў Менску ў лютым месяцы, прыяжджаюць старшыня Галоўпалітасьветы РСФСР тав. КРУПСКАЯ і яе намесьнік тав. МЕШЧАРАКОЎ.

У організацыйную камісію па скліканьню зьезду ўключан прадстаўнік ЦК ЛКСМБ.

Мяркуецца ў часе зьезду склікаць нараду комсамольцаў—загадчыкаў хат-чытален.

Клюб будзе.

Саўнаркам адпусьціў 3.000 руб. на організацыю студэнцкага клюбу ў горадзе Менску.

18.000 руб.—школам рабочай моладзі.

Саўнаркомам БССР адпушчана 18.000 руб. у якасьці субсыдыі мястэчковым школам рабочай моладзі.

Субсыдыя разьмеркавана па акругам.

Запытаньні і адказы

ЗАПЫТАНЬНЕ № 775 (Падольва). Ці есьць літаратура аб працы юнкору на беларускай мове?

АДКАЗ. Пакуль што няма.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 776 (Санкіна). Ці можна пісаць корэспондэнцыю у якую небудзь газэту на картках.

АДКАЗ. Гэта не забараняецца, але лепш дасылаць корэспондэнцыі лістамі.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 777 (Калбоускага). Чаму за апошні час усім ня відаць у газэце паштовай скрынкі?

АДКАЗ Таму, што рэдакцыя адказвае свім корэспондэнтам праз асабістыя лісты.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 778 (Шапіра). Ці можна пасылаць допісы на расійскай мове?

АДКАЗ. Калі не ўмееш беларускай мовы, можаш пісаць па-расейску.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 779 (Ш.) Чаму у «Чырвонай Зьмене» мала асьвятляецца жыцьцё піонэраў?

АДКАЗ. У нас есьць для гэтага спэцыяльная часопісь «Беларускі піонэр» і агрэская газэта «Юны піонэр». Гэтыя выданьні даюць кірунак у піонэрскай працы, а таксама асьвятляюць піонэрскае жыцьцё. У «Чырвонай Зьмене» пэрыядычна зьмяшчаецца аддзел «Ленінскія унукаты».

ЗАПЫТАНЬНЕ № 780. (Патруся). Ці будуць друкавацца у «Чырвонай Зьмене» матар'ялы аб працы юнсельскорэўскіх гурткоў у весцы.

АДКАЗ. Будуць. У «Чырвонай Зьмене» зьмяшчаецца аддзел «сярод юнкораў».

У тры радкі

▣ Начныя заняткі для падросткаў забаронены Наркампрацы ў шкляной і папяровай вытворчасьцях. Наказ праводзіцца ў жыцьцё па зацьверджаньні яго СНК.

▣ Школы вышэйшага тыпу для польскіх рабочых адчыняюцца ў Менску ў бліжэйшым часе. Усяго будзе навучацца ў іх да 200 чал.

▣ Шэраг яўрэйскіх школ адчыняецца ў лютым месяцы на акрайнах Менску.

▣ Перарэгістрацыя шахматна-шашачных гурткоў БССР распачынаецца 25 студзеня г. г.

▣ Дзеля папулярызацыі ідэй Авіахіму ў вёсцы ў працягу лютага месяца праводзіцца па БССР аэрасанны прабег.

Дэмонстрацыя нашых Капабланак.

Першы шахматна-шашачны турнір Менскай моладзі.

Юнсэкцыі клюбаў Мэдсанпрацы і Зах. Чыгункі імя Леніна організавал першы шахматна шашачны турнір.—Вынікі турніру наступныя: пераможнікі па шахматам—чыгуначнікі, па шашкам—мэдпрацаўнікі.—Турнір прашоў вельмі жвава.—Юнсэкцыі, скарыстайце гэты вопыт!

Па ініцыятыве Ляхаўскага райкому ЛКСМБ быў організаваны першы Менскі шахматна-шашачны турнір моладзі.

У турніры прымалі ўдзел юнсэкцыі клюбаў Мэдсанпрацы і Зах. Чыгункі імя Леніна.

Сябры юнсэкцый доўга рыхтаваліся да турніру. У працягу некалькіх дзён у абодвых клюбах адбываліся спаборніцтвы па шахматам і шашкам паміж моладзьдзю. Гэта была так сказаць, „рэпэтыцыя“. «Байцы» вывучалі прыёмы барацьбы, каб не асароміцца, каб абавязкова дабіцца перамогі.

Для ўдзелу ў турніры былі вылучаны лепшыя ігракі юнсэкцыі.

Першае спатканьне па шахматам адбылася ў клюбе ім. Леніна. Прымалі ўдзел у гэтым спатканьні 7 чыгуначнікаў і 8 мэдпрацаўнікоў.

Удзельнікі турніру гулялі з вялікім энтузіязмам. Абодвы бакі жадалі ва што-бы та ні стала пераможчы.

Барацьба на дошках станавілася надзвычайна ўпартай...

Ужо перад скончаньнем высьнілася, што чыгуначнікі мацней мэдпрацаўнікоў. Апошнім прышлося „скласьці аружжа“.

Другое спатканьне па шахматам у клюбе Мэдсантруд прашло таксама з посьпехам чыгуначнікаў.

У выніку шахматнага турніру: $10^1/_2:3^1/_2$ у карысьць чыгуначнікаў.

Але ў шашках мэдпрацаўнікі аказаліся мацней чыгуначнікаў. Прымалі ўдзел у шашачным турніры па 11 чалавек ад кожнай стараны, гулялі па 4 разы.

У выніку шашачнага турніру: 29:15 у карысьць мэдпрацаўнікоў.

14 студзеня першы Менскі шахматна шашачны турнір моладзі скончыўся. Такім чынам, па шахматах перамаглі чыгуначнікі, а па шашках—мэдпрацаўнікі.

Дзеля разьмеркаваньня прызоў паміж пераможшымі організавана камісія ў складзе прадстаўнікоў абодвых юнсэкцый, Вышэйшага Савету Фізкультуры Беларусі і райкому ЛКСМБ.

КРУК.

Новыя маладнякоўскія кніжкі.

ЦБ „Маладняка“ здадзены ў друк наступныя кніжкі: Кляшторны—„Калясовыя завеі“, (зборнік вершаў) і п'еса Галубка „Пісаравыя імяніны“. Падрыхтавана да друку зборнік Янкі Купалы „Яна і я“.

Гэтымі днямі выйдзе з друку чарговы нумар альманаху Полацкай філіі Маладняка „Надзьвіньне“.

Што сказала акадэмічная конфэрэнцыя

Інстытут Беларускай Культуры рыхтуе да выданьня матар'ялы беларускай навуковай акадэмічнай конфэрэнцыі па рэформе правапісу і азбукі.

Гэты матар'ял зьяўляецца вельмі каштоўным укладам у справу вывучэньня беларускай мовы.

Беражы здароўе.

— Па матар'ялам антропомэтрычнага габінэту цэнтральнага дзіцячага дыспансэру відаць, што ў Менску 4.8 проц. дзяцей хворых на сухоты і 93 проц. з падазрэньнем на сухоты.

— У 1926 годзе праз мэдыцынскі агляд прашло 11.500 чалавек моладзі. Па данным гэтага агляду займаюцца фізкультурай 28.9 проц. Агульны процант хворых сярод рабочай моладзі дасягае 57,3 проц. Гэты процант вышэй проценту 1925 году.

Курсы кінопрацаўнікоў.

Белдзяржкіно організуе курсы кіномэханікаў для кіно перасовак.

Усяго на курсы будзе прынята каля 50 чалавек.

Курсы працягнуцца з 1-га лютага па 1-га красавіка г. г.

Курсанты будуць забясьпечаны на ўвесь час вучобы сталоўкай і інтэрнатам.

Па сканчэньню вучобы курсантаў адразу разашлюць па раёнах БССР.

11, 12 і 13 лютага

будзе працаваць Усебеларускі Краязнаўчы Зьезд.

10-га лютага склікаецца другі Ўсебеларускі зьезд краязнаўчых організацый, які мае на мэце высьвятліць цэлы шэраг мэтодычных пытаньняў усіх галін краязнаўчай працы. Зьезд працягнецца 3 дні—11, 12, 13 лютага.

На зьезд запрашаюцца з месц 125 сяброў краязнаўчых гурткоў. Таксама будуць прысутнічаць па 3 прадстаўнікі ад кожнай акругі, па аднаму ад раёну і аднаму ад 5 студэнцкіх гурткоў.

На зьезде будуць працаваць сэкцыі: грамадзка-экономічная, прыродна-географічная, культурна-гістарычная і сэкцыя школьнага краязнаўства.

Парадак дню зьезду наступны: Справаздача Цэнтральнага Бюро Краязнаўства і пэрспэктывы далейшай працы (Казак); Дзейнасьць краязнаўчай сеткі БССР (Касьпяровіч); Узорнае вывучэньне раёну; Організацыя і тып краязнаўчага музэю; Зацьверджаньне рэзолюцый пленуму і сэкцый.

Усе даклады на зьезьдзе будуць выданы асобным зборнікам.

Новая пастаноўка клюбу «КІМ»

У нядзелю 23-га і панядзелак 24-га студзеня г. г. яўрэйскі драматычны гурток ставіць п'есу Л. Каповіча „У тыя дні“, якая асьвятляе падпольную працу комсамольцаў у часе польскай акупацыі. У п'есе прымаюць удзел 35 чал.

Білеты ад 20 да 25 кап. пры ўваходзе Колектыўна можна атрымаць скідку. Пажадана, каб комсамольцы зьявіліся разам з беспартыйнай рабочай моладзьдзю і дарослымі рабочымі.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

«Юный коммунист»—тэорэтычна-політычная часопісь ЦК УсеЛКСМ № 21—Выдавецтва «Молодая Гвардия».

Перадавы артыкул тав. Чапліна „Против казенщины! За живое конкретное дело“ прысьвечан грамадзка-політычнай актыўнасьці рабочай моладзі.

На пытаньне ці ёсьць спад гэтай актыўнасьці?—аўтар дае адмоўны адказ, указваючы, што цялер аб грамадзка-політычнай актыўнасьці судзяць не па ліку дэмонстрацый і мітынгаў, а па ўдзелу ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Таксама адмоўны адказ дае т. Чаплін на пытаньне аб адсутнасьці ў нашай моладзі зацікаўленасьці барацьбой міжнароднай рабочай клясы і міжнароднай рабочай моладзі: «на ўсіх сходах рабочай моладзі па кожнаму дакладу падаецца шматлікавая колькасьць пісуляк з пытаньнямі аб жыцьці замежных комсамольцаў, аб становішчы ў Кітаі, Англіі і г. д.».

Другое пытаньне, якое разабрана ў гэтым артыкулу—гэта аб „крызісу росту“ у саюзе і неабходнасьці прыстасаваньня нашай працы да новых умоў. Кіраўнічая роля нашых камітэтаў павінна заключацца ў падагульваньні вопыту працы асобных ячэек і распаўсюджваньні яго на ўсю організацыю. Тут-жа як прыклад, прыводзіцца праца Дняпро-Пятроўскай організацыі.

У артыкуле падрабязгова разьбіраецца пытаньне аб уплыву комсамолу на моладзь, асабліва на сялянскую. Тут на дапамогу ЛКСМ павінны прыйсьці розныя організацыі, як напрыклад: „Т-ва юных натуралістых“, „Т-ва радыёпрыхільнікаў“ і г. д., праз якія комсамольская організацыя будзе мець магчымасьць праводзіць свой уплыў на моладзь.

Другі артыкул тав. Рагыгіна «У последней черты» у сьціслым і зразумелым выкладаньні выясьняе сутнасьць выступленьня опозіцыі.

Спыняючыся на пытаньні аб нашай экономіцы, аўтар разглядае ўсе абвінавачваньні опозіцыі, досыць добра разьбівае іх, паказваючы на ўсю іх галаслоўнасьць.

Артыкул т. Розэнталя „Экономическая платформа опозиции“ высьвятляе памылковасьць конкрэтных прапаноў, якія былі высунуты опозіцыяй.

Вельмі цікавым зьяўляецца артыкул А. Г. „Ким и крестьянская молодежь,“ які друкуецца ў дыскусійным парадку, ўказваючы на важнасьць сялянскага пытаньня, як для партыі, так і для комсамолу на сутнасьць конкрэтных задач розных сэкцыі КІМ па сялянскаму пытаньню.

Артыкулы Калесьнікава «Раздавим гадину» (аб задачах комсамолу ў барацьбе з бюрократызмам) сьветава „Аб настроях Сялянскай Моладзі“, Емельянава „Комсамол на кооперативном фронте“ маюць каштоўнасьць, як кіраўнічы матар'ял і не павінны прайсьці міма ўвагі комсамольца-актывіста. Ня меньш каштоўным зьяўляецца аддзел бібліографіі.

Часопісь павінна быць праправована кожным комсамольцам, бо яна высьвятляе і дае ўсебековы адказ на цэлы шэраг чарговых пытаньняў комсамольскай працы.

Р. Гольдзін.

Апавяшчэньні.

У нядзелю 30 студзеня а 10 гадзіне раніцы адбудзецца агульны сход ячэйкі ЛКСМБ працасьветы.

У суботу 29 студзеня клюб КІМ праводзіць комсамольскі вечар на карысьць падшэфнага ЛКСМБ лінкора „Парыская Комуна“.

Жыцьцё--на цынкавую пласьцінку.

Ніжэй друкуем нарыс, які дае ўяўленьне аб працы цынкаграфіі дзе вырабляюцца газэтныя кліші.

Часта мы бачым у нашых газэтах розныя прыгожыя малюнкі. Многія чулі, што малюнкі гэтыя на „газэтнай мове“ называюцца „клішэ“. Але як і дзе робяцца гэтыя „клішэ“—мала, хто ведае... А гэта цікава!

Чорныя сьцены. Падлогі таксама чорныя ад ўсё разьядаючай кіслаты. Валяюцца абрэзкі цынку...

Такое ўражаньне ад цынкаграфіі Белдзяржвыдавецтва.

У гэтых 3-х паўзмрочных пакоях, будзь раніца, будзь позьні вечар прыглушана шуміць моцны электрычны вінцілятар. Яго „задача“—асьвяжыць паветра. Вінцілятар, аднак, мала дапамагае... У пакоях пануе востры пах кіслаты, якая салодкім, шчыплючым налётам кладзецца на лёгкія.

Спачатку пахучы газ удыхаецца поўнай грудзьдзю, але праз пару хвілін ад яго адчуваецца некая дасканалая няпрыемнасьць. З няпрывычкі ахвота кашлянуць....

— Гэта-ж шкодна!.. Як можна дыхаць такім паветрам?.

Хлапец, які нечага капаўся вакол кавалку цынку, шчыра ад душы засьмяяўся:

— Што, спужаўся?... А нас брат, жаба не бярэ!.. Масла і малака лепш усяго абараняюць лёгкія ад кіслаты. Да таго-ж мы працуем не 8, а 7 гадзін...

Падыходжу да стола з прыборамі.

У фарфоравую, белую ваннчку кладзецца для пратраўкі сьвінцовая пласьцінка. Гэта фотографія ўжо перазьнятая на цынкавую пласьцінку—будучае клішэ.

Усе сьветлыя месцы, якія не захапіла фотографічная плёнка—трэба вытравіць.

— Навошта?

— А справа ў тым, што калі кіслата ня выпаліць усіх паглыбленьняў на гэтай пласьцінцы—будучае клішэ нічога варта ня будзе. Яно тады будзе прадстаўляць з сябе нішто іншае, як чорную, невыразную пляму а не ясны малюнак, карыкатуру, альбо партрэт, які мы бачым штодзённа на старонках газэты.

* * *

Кіслата есьць упарта есьць прасьветы не абароненыя фотографічнай плёнкай—і ў выніку тут акавываюцца досыць значныя паглыбленьні.

Гэта кропатлівая праца. Пасьля першай траўкі, каб не псавалася сама плёнка пласьцінку пракатваюць смаляным валікам. Гэта ізноў новая праца-прасьветы засмальцоўваюцца і іх ужо трэба адчышчаць разцом.

Клішэ для набіўкі ужо гатова. Яно блішчыць, як люстра.

Віжжыць электрычны варштат—клішэ адфальцована... І зноў жа, другі электрычны варштат абрэзвае калодку.

Цынкавая пласьцінка, якая адлівае чыстым блескам мэталю—набіта на калодку. Клішэ гатова!

Цяпер яно накіроўваецца ў друкарню.

А праз некалькі гадзін з пад лопасьцяў друкарскай машыны вылятаюць сьвежыя нумары газэты з чоткімі малюнкамі...

* * *

Цынкаграфская справа вельмі цікавая і занятная. Асабліва гэтым цікавіцца моладзь.

Аднак, раней пры былым загадчыку—наша цынкаграфія для моладзі была амаль недаступнай. Колькі-б хлапец ні біўся—ён кваліфікацыі атрымаць ня мог.

Былы загадчык не знаёміў вучняў з сакрэтамі цынкаграфіі. Ён заўсёды як чарадзей, таемна нешта рабіў з кіслотамі, цынкам. Для вучняў усе было пакрыта „змрокам невядомасьці“

Зьявіўся новы загадчык. Хлапцы ўздыхнулі лягчэй.

Цяпер хлапцы працуюць ня горш старыкоў рабочых.

Ю. КАВАЛЬ.

КЛЮБ КІМ ПАД СУДОМ.

Што організуе рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“.

У пятні у 28 студзеня рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ праводзіць суд над працай клюбу КІМ

Запрашаюцца усе працаўнікі юнсэкцый, сакратары і апоргі ячэек клюбныя працаўнікі і комсамольцы

Адказныя рэдактары: { А. БАРАНЬНІКАЎ, В. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 23707 2-ая Дзяржзрукарня БДВ.